Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

28 студзеня 2011 года, № 1-2 (2039-2040)

АКТУАЛЬНА

РЭКТАР БДУ ЗАВЁЎ ВІДЭАБЛОГ

Кіраўнік Белдзяржуніверсітэта акадэмік Сяргей Абламейка стаў першым у Беларусі рэктарам-блогерам. 19 студзеня яго пілотны відэапост прадстаўлены ў інтэрнэце на сайце БДУ.



У ім рэктар паабяцаў пару разоў у месяц выказвацца па асноўных тэмах, што хвалююць студэнтаў і выкладчыкаў. Гэтым разам Сяргей Абламейка падзяліўся сваім меркаваннем пра Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. Ён адзначыў, што дадзены дакумент падае шырокія магчымасці і канкрэтызуе шматлікія моманты, звязаныя не толькі з навучаннем, але і з выхаваннем.

Акрамя таго, рэктар выказаў сваё меркаванне з нагоды ўдзелу студэнтаў БДУ ў несанкцыяваным мітынгу на плошчы Незалежнасці 19 снежня. Прававую ацэнку гэтым падзеям ужо далі кампетэнтныя органы, і БДУ не плануе ніякіх жорсткіх санкцый. Студэнтам будуць абвешчаныя вымовы за парушэнне правіл унутранага распарадку.

Асобна кіраўнік ВНУ спыніўся на павышэнні платы за навучанне, прывёўшы аб'ектыўныя прычыны для такога кроку і растлумачыўшы гнуткую пазіцыю БДУ па змякчэнні адпаведнага падаражання для студэнтаў.

Таксама Сяргей Абламейка закрануў тэму развіцця інавацыйных інфармацыйных тэхналогій. Ён распавёў, што ВНУ падлучаны да шырокапалоснага інтэрнэту. Цяпер усе студэнты і выкладчыкі стануць яшчэ больш мабільнымі.

Першы відэаблок рэктара БДУ доўжыцца 11 хвілін. Дарэчы, такі фармат зваротнай сувязі спадабаўся інтэрнэт-карыстальнікам, якія за пару дзён пакінулі больш чым два дзясяткі добразычлівых водгукаў.

Глядзіце ў сеціве: *www.bsu.by/main.aspx?guid=91251*

Сяргей ШАФАЛОВІЧ

Чытайце ў нумары:

УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК БДУ – СЛАВУТАСЦЬ СТАЛІЦЫ

Будынкі, размешчаныя ва ўнутраным дворыку БДУ, дазваляюць прасачыць амаль усю яго шматгадовую гісторыю

Стар. 2

АСПІРАНТУРА F.A.Q. (Што вы хацелі і баяліся спытацца)

Наша газета распачынае цыкл матэрыялаў пра аспірантуру і аспірантаў

Стар. 4

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ ЎНІВЕРСІЯДА: БРОНЗА – ЯК ЗОЛАТА

Інтэрв'ю з загадчыкам кафедры фізвыхавання і спорту БДУ Віктарам КАЛЯДОЙ пра спартыўныя дасягненні, інфраструктуру і стан здароўя студэнтаў

Стар. 6

ВЯЛІКАЯ БУДУЧЫНЯ

Навуковыя вынікі 2010 года ў свеце

Стар. 8

УРАЧЫСТАСЦІ

КАЛЯДНАЯ ПРЭМІЯ НА ХРЫСЦІЯНСКІМ ВЕЧАРЫ

Штогадовую калядную прэмію «Хрысціянскія традыцыі ў культуры і адукацыі» ўручыў старшыня Хрысціянскага адукацыйнага цэнтра імя святых Мяфодзія і Кірылы Высокапраасвяшчэнны Філарэт, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, на XV Каляднай вечарыне, якая прайшла 12 студзеня ў Інстытуце тэалогіі БДУ.

Гэтай узнагародай адзначаюцца педагогі і духоўныя асобы, якія добра папрацавалі на ніве адраджэння хрысціянскіх традыцый і выхавання моладзі. Калядную прэмію за 2010 год атрымалі протаіерэй Яўген Ліхота і выкладчык кафедры рэлігіязнаўства Інстытута тэалогіі Уладзімір Марціновіч.

Я. Ліхота з'яўляецца настаяцелем Хрыста-Каляднага прыхода Брэста і кіраўніком аддзела рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі Брэсцкай епархіі. Айцец Яўген выкладае прадмет «Асновы праваслаўнай культуры» ў школах. Ён таксама духоўны папячыцель сястрыцтва ў гонар прападобнай Ефрасінні Полацкай і моладзевага брацтва ў гонар святога Кірылы Тураўскага. Выдае дзве прыходскія газеты.

У. Марціновіч, акрамя таго, што выкладае, з'яўляецца кіраўніком Інфармацыйна-кансультацыйнага цэнтра імя прападобнага Іосіфа Волацкага, рэферэнтам па пытаннях новых рэлігійных рухаў Мінскай епархіі.

Цэнтральнай падзеяй вечара стала прысваенне звання доктара honoris causa Інстытута тэалогіі БДУ сектаведу з сусветным імем, упаўнаважанаму евангелічнай царквы зямлі Берлін-Брандэнбург (ФРГ) па пытаннях новых рэлігійных рухаў, пастару Томасу Гандоу. Д-р Гандоу займаецца вывучэннем сектаў з 1978 г. Раней ён перадаў Беларускай праваслаўнай царкве свой асабісты архіў. Павіншаваў новага ганаровага доктара і рэктар БДУ Сяргей Абламейка.

На вечары была прэзентавана серыя кніг «Тэалогія ва ўніверсітэтах», выдадзеная Хрысціянкім адукацыйным цэнтрам пры падтрымцы каталіцкай царквы Францыі і Беларусі. Гэта шэраг унікальных міждысцыплінарных вучэбных

Новы ганаровы доктар Інстытута тэалогіі БДУ Томас Гандоу (крайні злева) выступае перад шаноўнай публікай

дапаможнікаў на стыку тэалогіі, філасофіі, гісторыі і рэлігіязнаўства, напісаных выкладчыкамі Інстытута тэалогіі БДУ. Выданні адаптаваны для выкарыстання спецыялістамі свецкіх гуманітарных навук. Вялікая ўвага надаецца праблемам дыялогу рэлігій і цывілізацый. Сярод аўтараў манаграфій і артыкулаў вядучыя тэолагі Беларусі, чый аўтарытэт прызнаны ў навуковым асяроддзі Еўропы: Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, прафесар Андрэй Данілаў, дацэнт Мікалай Сямёнаў, епіскап Гродзенскі Арцемій і іншыя. Усе кнігі выйшлі ў выдавецтве «Зорны Верасок» і разасланы па бібліятэках ВНУ.

Быў прэзентаваны і тэматычны каляндар на 2011 год «Свет Прамудрасці. Армянская кніжная мініяцюра». Ён створаны з дапамогай італьянскага каталіцкага фонду «Хрысціянская Расія» і маскоўскага культурнага цэнтра «Духоўная бібліятэка». Выданне з'яўляецца працягам серыі календароў, якія ў розныя гады прысвячаліся іканапісу Расіі, Беларусі, Італіі, Егіпта. На гэты раз такі каляндар уключае 24 рэпрадукцыі кніжных мініяцюр сярэднявечнай Арменіі з падрабязнымі каментарыямі.

Невыпадкова частка вечарыны была прысвечана армянскай духоўнай культуры: са святочным канцэртам выступіў харэаграфічны ансамбль армянскай дыяспары «Эрэбуні», была наладжана выстава армянскага мастака Спартака Аруцюняна.

Віншуючы супрацоўнікаў і гасцей інстытута са святам Нараджэння Хрыстова, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Архібіскуп Тадэвуш Кандрусевіч падкрэсліў важнасць прызнання тэалогіі паўнавартаснай навуковай дысцыплінай. А намеснік упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Ламека падкрэсліў, што ў краіне ўмацоўваецца супрацоўніцтва Царквы і дзяржавы, развіваецца садружнасць вядучых канфесій.

Ганна ЛАГУН

ДА 90-ГОДДЗЯ БДУ

Універсітэцкі гарадок БДУ – славутасць сталіцы

Будынкі, размешчаныя ва ўнутраным дворыку БДУ, дазваляюць прасачыць амаль усю яго шматгадовую гісторыю. 20–30-я гады XX ст. у гісторыі ўніверсітэта – перыяд станаўлення і хуткага развіцця.

Самы стары будынак універсітэта – цяперашні рэктарат БДУ. Будаўніцтва аднаго з першых карпусоў універсітэта ў сярэдзіне 20-х гадоў XX ст. было выклікана патрэбамі ў новых памяшканнях. Менавіта тады па праекце архітэктара Радзіевіча быў пабудаваны новы вучэбна-лабараторны корпус, які адчыніў свае дзверы ў 1925 г. Каб захаваць агульны выгляд кампазіцыі, новы будынак быў узведзены ў тым жа архітэктурным стылі, што і камерцыйнае вучылішча (пабудавана яшчэ ў пачатку XX стагоддзя), і размяшчаўся недалёка ад яго (зараз плошча Незалежнасці). Дарэчы, у будынку вучылішча пэўны час месцілася педагагічнае аддзяленне БДУ, пазней яно было перададзена Інстытуту народнай гаспадаркі. Па звестках даследчыка М. І. Красоўскага, калі ў Мінску праводзіліся зямельныя работы па пашырэнні плошчы імя Леніна (зараз плошча Незалежнасці), пад руінамі былога будынка інстытута быў ускрыты склеп, у якім у гады вайны знаходзілася служба бяспекі СД. Тут былі выяўленыя шматлікія дакументы часоў фашысцкай акупацыі.

Спачатку ў новым корпусе размясціўся фізічны інстытут БДУ, а з 1931 г. – фізіка-матэматычны факультэт. Падчас вайны будынак фізмата ацалеў (у ім была АТС), і ў 1945 г. пасля рамонту зноў прыняў у свае сцены студэнтаў БДУ. У яго аўдыторыях і лабараторыях працягвалі сваю вучобу фізматаўцы, ішлі заняткі са студэнтамі іншых факультэтаў, размяшчаліся некаторыя аддзелы і службы ўніверсітэта, рэдакцыя газеты «Беларускі ўніверсітэт». У 70-я гады тут вучыліся студэнты фізічнага факультэта, там жа знаходзілася кафедра фізікі паўправаднікоў, некаторыя лабараторыі, газгольдарная станцыя.

Праз шмат гадоў эксплуатацыі давялося закрыць будынак на капітальны рамонт, які прыпаў на пачатак 90-х гадоў. Рамонт корпуса перарос у рэстаўрацыю, якая завяршылася ў 1998 г. У выніку рэстаўрацыі будынак набыў новую значнасць, стаў больш прыгожым. Пры гэтым у архітэктурны выгляд будынка былі ўнесены пэўныя змены, абумоўленыя яго новым прызначэннем: у ім размясцілася адміністрацыя ўніверсітэта. Для зручнасці галоўны ўваход будынка быў перанесены з боку Вялікага двара, бо ранейшы ўваход яшчэ ў 60-я гады быў перакрыты фізічным корпусам. Унутраныя памяшканні (ранейшыя аўдыторыі і лабараторыі) таксама падвергліся рэстаўрацыі, ператварыўшыся ва ўтульныя кабінеты, прасторныя прыёмныя пакоі, вялікія залы. Да ліку апошніх адносяцца габеленавая зала (у ёй знаходзяцца 6 габеленаў мастакоў Валянціны Маркавец і Леаніда Бартлава) і зала пасяджэнняў Вучонага савета.

І ўсё-такі пасля рэстаўрацыі будынак захаваў усе рысы помніка архітэктуры пачатку XX стагоддзя.

Будаўніцтва ўніверсітэцкага гарадка пачалося па рашэнні VIII Усебеларускага з'езду Саветаў 6 лістапада 1927 г. Было выдаткавана 6,4 млн руб. На месцы будучага ўніверсітэцкага гарадка знаходзіліся старыя яўрэйскія могілкі і невялікая абутковая фабрыка, якія падлягалі зносу.



Агульны выгляд універсітэцкага гарадка ў 30-я гг. (з боку цяперашняй плошчы Незалежнасці). На заднім плане: корпус прыродазнаўчага факультэта (сучасны геафак) і хімічнага факультэта (НДІ ядзерных праблем). На пярэднім плане справа: будынак былога камерцыйнага вучылішча

Планавалася пабудаваць галоўны аўдыторны, анатамічны, прыродазнаўчы і хімічны карпусы, інтэрнат для студэнтаў універсітэта (перш за ўсё рабфака), 2 карпусы кватэр для выкладчыкаў, 2 карпусы для абслуговага персаналу, неабходныя дапаможныя памяшканні, лазню і гараж.

Архітэктарамі, якія праектавалі ўніверсітэцкі гарадок, былі І. Запарожац і Г. Лаўроў. У аснову кампазіцыі быў пакладзены павільённы прынцып (у асобных 3-павярховых будынках павінны былі размяшчацца факультэты).

23 лістапада 1928 г. на пасяджэнні праўлення БДУ слухаўся даклад Лаўрова, у якім гаварылася, што ідзе будаўніцтва 5 карпусоў універсітэцкага гарадка аб'ёмам 180 тыс. куб. м. Усе карпусы трохпавярховыя, акрамя галоўнага аўдыторнага, дзе планаваўся цокальны паверх. У галоўным корпусе меркавалася размясціць студэнцкі інтэрнат на 500 месцаў.

У маі 1929 г. скончылася будаўніцтва хімічнага, медыцынскага, анатамічнага, прыродазнаўчага карпусоў. Быў узведзены другі паверх галоўнага корпуса. З заканчэннем работ ва ўнутраным дворыку ўніверсітэта планавалася пасадка саду з 1 тыс. дрэў. Гарадок павінен быў заняць 14 гектараў і ўключыць два будынкі педфака (Земляробчы зав., 2, 4).

У канцы мая 1929 г. гарсавет вылучыў наркамату адукацыі пад будаўніцтва ўніверсітэцкай бібліятэкі ўчастак на скрыжаванні вуліц Універсітэцкай (сёння Кірава) і Чырвонаармейскай.

У чэрвені 1930 г. будаўніцтва ўніверсітэцкага гарадка было ўключана ў саюзны бюджэт. Будаўніцтва аб'екта на 500 аўдыторый, лабараторый і іншых вучэбных памяшканняў, разлічаных на 3 тыс. студэнтаў, планавалася скончыць да 7 лістапада 1930 г. У прыродазнаўчым корпусе былі размешчаныя 2 аранжарэі. Плошча лекцыйнай залы анатамічнага корпуса была 375 кв. м. Аб'ём галоўнага корпуса – 65 тыс. куб. м. Планаваўся інтэрнат на цокальным паверсе для 250 студэнтаў і сад на 900 кв. м. на даху над актавай залай на 1 тыс. месцаў.

Корпус фізіка-матэматычнага факультэта 1925 г. стаў першым будынкам уласна для ўніверсітэта (зараз – рэктарат).

Фантан. Фота 1939 г.

Падчас вайны большая частка ўніверсітэцкага дворыка была разбурана, ацалела некалькі будынкаў: сучасны рэктарат, прыродазнаўчы корпус і часткова будынак сучаснага НДІ ЯП. Студэнты і выкладчыкі аднаўлялі будынкі БДУ сваімі рукамі.

Аднак ужо ў першай палове 1950-х гадоў зноў стала бракаваць плошчаў. Не магла вырашыць праблему і перадача БДУ дадатковых будынкаў (корпус па вул. Акадэмічнай, 4). Зважаючы на ўсё гэта, 21 мая 1957 г. Савет Міністраў БССР прыняў пастанову аб будаўніцтве ў 1957–1959 гг. новага галоўнага корпуса ўніверсітэта.

2 лістапада 1958 г. ва ўрачыстай абстаноўцы быў закладзены падмурак. І ўжо 7 лістапада 1961 г. універсітэт атрымаў галоўны корпус. Архітэктары М. Бакланаў і А. Духан выбудавалі фасад з дапамогай вертыкальнага члянення, што адпавядала характару архітэктуры Дома ўрада.

На чарзе былі новыя будынкі. Так, у верасні 1966 г. расчыніў свае дзверы корпус радыёфізікі і электронікі; у верасні 1972 г. у новы корпус пераехаў хімічны факультэт (стары перадалі юрыдычнаму факультэту).

7 мая 1975 г. архітэктурны ансамбль універсітэцкага гарадка дапоўніў помнік студэнтам і выкладчыкам БДУ, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (архітэктары І. Пілатовіч і У. Дзятлаў). Першы абеліск на гэтым месцы быў усталяваны ў 1948 г., які ў сваю чаргу змяніў ранейшы драўляны, усталяваны на магіле героя СССР гвардыі палкоўніка У. Л. Каргузалава. Яго пахавалі ў скверыку 14 ліпеня 1944 г. Як паведамляла ўніверсітэцкая газета ад 6 ліпеня 1948 г., Уладзімір Леанідавіч Каргузалаў удзельнічаў у баях на тэрыторыі ўніверсітэцкага гарадка. У 1957 г. яго астанкі былі перанесеныя на Вайсковыя могілкі. Сам помнік мае ромбападобную форму, якая ў цэнтры прарэзана вінтоўкай. Прататыпам стаў нагрудны знак для асоб, якія скончылі ўніверсітэты (быў уведзены ў 1945 г.).

З новымі выпрабаваннямі кіраўніцтва ўніверсітэта сустрэлася ў 1977 г., калі пачалося будаўніцтва Мінскага метрапалітэна. Паводле плана яго будаўніцтва зносу падлягаў юрыдычны корпус. Будаўнічыя работы закраналі ўнутраны двор універсітэта, таму рэктар У.А. Белы паклапаціўся, каб захаваць яго ўнутраны выгляд: усё было сфатаграфавана, а з кіраўніцтва метрабуду ўзята абавязальніцтва, што пасля заканчэння работ усё будзе адноўлена ў першапачатковым выглядзе. На жаль, гэта не было выканана, у прыватнасці, быў знесены фантан у цэнтры ўніверсітэцкага гарадка, які быў пабудаваны ў 20–30-я гады XX стагоддзя, а ў снежні 1987 г. па віне работнікаў метрабуду трэснула сцяна правага крыла галоўнага корпуса.

Другая палова 80-х і пачатак 90-х гадоў XX стагоддзя былі самымі цяжкімі: на працяг будаўніцтва і падтрымку існуючых карпусоў катастрафічна не хапала сродкаў і матэрыялаў. Толькі з сярэдзіны 90-х гадоў у БДУ разгарнулася сапраўдная праца па будаўніцтве і рамонце навучальных карпусоў і інтэрнатаў.

У 2001 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё рэканструяваных карпусоў геаграфічнага і фізічнага факультэтаў. У 2005 г. у новы корпус пераехаў юрыдычны факультэт.

Унутраны двор БДУ ўяўляе сабой прыклад музея пад адкрытым небам, дзе размяшчаюцца не толькі ўніверсітэцкія будынкі, але і помнікі вядомым беларусам, якія заклалі аснову адукацыі ў нашай краіне. Помнікі ўсходнеславянскаму першадрукару, навукоўцу, перакладчыку Бібліі на старабеларускую мову Францыску Скарыну, беларускаму паэту-лацініста і дыпламату, аўтару несмяротнай «Песні пра зубра» Міколу Гусоўскаму (скульптары С.А. Адашкевіч і У.І. Панцялееў) былі падораны ў 1998 г. кіраўніком клуба «Спадчына» Белым А.Я. У 1999 г. перад будынкам рэктарата БДУ была ўсталяваная скульптура асветніцы і заступніцы беларускай зямлі святой Ефрасінні Полацкай (скульптар І.У. Голубеў). У 2000 г. з'явілася скульптурная група «Дыспут» – помнік дзеячам эпохі Адраджэння і Рэфармацыі, пісьменнікам і філосафам, педагогам і багасловам, асветнікам і гуманістам Сымону Буднаму і Васілю Цяпінскаму. У кастрычніку 2001 г. скульптурны ансамбль унутранага дворыка БДУ дапоўніў помнік царкоўнаму дзеячу і прапаведніку, старабеларускаму пісьменніку, «славянскаму Залатавусту» Кірылу Тураўскаму (аўтар А. Прохараў).

Так склаўся сучасны знешні выгляд універсітэцкага гарадка.

Па матэрыялах
Музея гісторыі БДУ

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

ЧЭШСКІ АСЯРОДАК

Урачыстае адкрыццё навучальнага кабінета чэшскай філалогіі адбылося 12 студзеня на філалагічным факультэце (аўд. 222, вул. К. Маркса, 31).

У цырымоніі ўзялі ўдзел рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, дэкан філалагічнага факультэта прафесар Іван Роўда, выкладчыкі і студэнты ВНУ. Ганаровы госць – Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Чэшскай Рэспублікі ў нашай краіне Йіржы Карас.

На сёння ў кабінеце сфарміраваны ўнікальны фонд навуковай і навучальнай літаратуры на чэшскай мове, што дазволіць выкладчыкам і студэнтам працаваць з арыгінальнымі матэрыяламі па лінгвістыцы, гісторыі, мастацтве і краіназнаўстве Чэхіі. Плануецца, што тут будуць праходзіць таксама сустрэчы з чэшскай інтэлігенцыяй, семінары, канферэнцыі, ажыццяўляцца навуковыя даследаванні па праблемах мовы, культуры і гісторыі Чэшскай Рэспублікі.

Дзякуючы чэшскай амбасадзе кабінету перададзены 10 адзінак камп'ютарнай тэхнікі, інтэрактыўная дошка ў якасці мультымедыйнага сродку і многафункцыянальная капіравальная прылада.

Злева направа: прафесар Барыс Норман, загадчык кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства дацэнт Людміла Казлоўская, дэкан філалагічнага факультэта прафесар Іван Роўда, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Чэшскай Рэспублікі Йіржы Карас, рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка

ДАВЕДКА

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт – адзіная вышэйшая навучальная ўстанова ў нашай краіне, дзе з 1996 г. вывучаецца чэшская мова. Усяго на базе ВНУ па спецыяльнасці «Філолаг, выкладчык чэшскай мовы і літаратуры» выпушчана каля паўсотні спецыялістаў і праходзяць падрыхтоўку амаль 30 студэнтаў. Дарэчы, на факультэце ўжо дзейнічаюць 7 падобных навучальных кабінетаў: беларускай, украінскай, польскай, паўднёваславянскай, італьянскай, нямецкай і кітайскай філалогіі.

Анастасія РАГАТКО

ВІКТАРЫНА

СКАРБОНКА ВЕДАЎ ПРА АЛЬМА-МАТАР

Штогод у нашым універсітэце праводзіцца віктарына для студэнтаў «Папараць-кветка зацвітае для цябе ў БДУ».

Дзякуючы намаганням упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю, пры ўдзеле кафедры беларускай літаратуры і культуры філалагічнага факультэта і пры інфармацыйнай падтрымцы газеты «Універсітэт» прайшла яна і ў гэтым навучальным годзе.

Нарэшце падведзены вынікі. Пераможцамі абвешчаны:

1 месца – *Павел Князеў*, эканамічны факультэт, 2 курс;

2 месца – *Юлія Шылава*, біялагічны факультэт, 4 курс;

3 месца – *Сяргей Волкаў*, Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій, 1 курс.

Памер прэмій сёлета склаў: 400, 300 і 250 тыс. руб. адпаведна.

Яшчэ тры заахвочвальныя прэміі па 100 тыс. руб. атрымалі *Ала Бондарава* (4 курс гістарычнага факультэта), *Валерыя Пучыла* (1 курс філалагічнага факультэта) і *Кацярына Батвінка* (2 курс ІБМТ).

Пры падвядзенні вынікаў улічвалася не толькі правільнасць і пісьменнасць дасланых на конкурс адказаў, але і афармленне працы, яе творчая падача. Над пытаннямі віктарыны працаваў сябар Саюза пісьменнікаў Беларусі дацэнт Уладзімір Навумовіч.

Лаўрэаты віктарыны, вядома, спадзяваліся на поспех, але нашым віншаванням прыемна здзівіліся.

Абсалютны пераможца Павел Князеў распавёў, што ўжо трэці раз браў удзел у віктарыне. Даведаўся пра яе на сайце БДУ і вырашыў паспрабаваць свае сілы: «Я стараўся не толькі даць правільныя адказы на пытанні, але і растлумачыць іх каментарамі. Вось і ўвесь сакрэт поспеху!»

Юлія Шылава была так узрушана перамогай, што змагла падзяліцца ўражаннямі не адразу: «Я, вядома ж, хацела перамагчы, але ўсё гэта вельмі нечакана. Дзякуючы віктарыне я даведалася шмат чаго новага пра наш універсітэт, прачытала кнігі, якія наўрад ці ўзяла б у рукі, каб не конкурс. Так што ён даў мне новыя веды».

Застаецца толькі радавацца, што наша ВНУ рыхтуе такіх разумных і начытаных маладых спецыялістаў. Віншуем пераможцаў.

Кацярына РАМАНАВА

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: біяхіміі, міжнародных эканамічных адносін, усходніх моў, тэорыі і метадалогіі журналістыкі, крыміналістыкі, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, паліталогіі;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: высокамалекулярных злучэнняў, міжнародных адносін;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, лазернай фізікі і спектраскапіі, агульнай фізікі, фізікі цвёрдага цела, ядзернай фізікі, дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу, вышэйшай алгебры і аховы інфармацыі, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, вэб-тэхналогій і кампʼютарнага мадэлявання, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, біяхіміі, батанікі, аналітычнай хіміі, неарганічнай хіміі, міжнародных адносін, міжнародных эканамічных адносін, мытнай справы, тэорыі і метадалогіі журналістыкі, тэлебачання і радыёвяшчання, тэхналогій камунікацыі, грамадзянскага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, фізічнага выхавання і спорту, гісторыі беларускай літаратуры, беларускай літаратуры і культуры, замежнай літаратуры, гісторыі беларускай мовы;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай матэматыкі і інфарматыкі, агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі, фізічнага выхавання і спорту.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н.СЕЎЧАНКІ БДУ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

- старшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці прыборы і метады эксперыментальнай фізікі – 1;
- навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці аптычныя і оптыка-электронныя прыборы і комплексы – 1;
- навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці аўтаматызацыя і кіраванне тэхналагічнымі працэсамі і вытворчасцямі – 1;
- малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці высокамалекульныя злучэнні – 1.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 212-48-43.

ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ І МЕНЕДЖМЕНТУ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

ажыццяўляе набор слухачоў на 2011–12 навучальны год на праграму перападрыхтоўкі па спецыяльнасцях **«Інавацыйны менеджмент»** і **«Інвестыцыйны менеджмент»** з прысваеннем кваліфікацыі **«менеджар-эканаміст».**

Працягласць навучання – 18 месяцаў (вочная вячэрняя форма навучання) і 19 месяцаў (завочная форма навучання). Запрашаюцца асобы, якія маюць вышэйшую адукацыю, а таксама студэнты 4–5 курсаў.

Дакументы прымаюцца да 10 лютага.

Тэлефон для даведак: 259-70-71.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Місія выканальная

Вучні 11 класа Ліцэя БДУ Уладзіслаў Сатанеўскі і Генадзь Клімук сталі залатымі прызёрамі па матэматыцы на VII Міжнароднай Жаўтыкоўскай алімпіядзе па матэматыцы, фізіцы і інфарматыцы, якая праходзіла з 14 па 20 студзеня ў г. Алматы (Рэспубліка Казахстан).

Акрамя таго, сярэбраныя ўзнагароды па фізіцы заваявалі адзінаццацікласнікі Аліса Токарава і Станіслаў Красулін, а бронзавую па матэматыцы – Марыя Манкевіч (10 клас). Такім чынам, прызёрамі сталі ўсе 5 удзельнікаў, якія прадстаўлялі Ліцэй БДУ. У камандным заліку на сёлетніх спаборніцтвах ліцэісты не ўдзельнічалі.

Усяго ж у алімпіядзе выступілі 296 навучэнцаў з 14 краін свету: Казахстана, Расіі, Румыніі, Балгарыі, Таджыкістана, Турцыі, Грузіі, Кыргызстана, Беларусі, Азербайджана, Інданезіі, Туркменістана, Арменіі і Манголіі.

Міжнародная Жаўтыкоўская алімпіяда праводзіцца ў гонар вядомага казахстанскага акадэміка і выдатнага навукоўца-матэматыка Арымбека Жаўтыкова пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і навукі Казахстана, а таксама карпарацыі Microsoft. Гэта ўнікальныя інтэлектуальныя спаборніцтвы сярод спецыялізаваных фізіка-матэматычных школ розных краін свету, якія маюць свой досвед і свой почырк працы з адоранымі дзецьмі. Міжнародная Жаўтыкоўская алімпіяда працягвае традыцыі былых усесаюзных алімпіяд, дае ўдзельнікам унікальны шанец для далейшага росту і развіцця здольнасцяў да дакладных навук.

Дар'я ЦАРЫК

Злева направа: Бахціна Таццяна Пятроўна (кіраўнік каманды), Манкевіч Марыя, Красулін Станіслаў, Токарава Аліса, Клімук Генадзь, Сатанеўскі Уладзіслаў

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Пра новыя спецыяльнасці геаграфічнага факультэта БДУ – «Настаўніцкая газета» (15.01).

Кошты ў сталовых мінскіх ВНУ – «Минский курьер» (14.01); belmy.by (17.01).

Пра навукова-даследчую лабараторыю – «Народная газета» (14.01).

Падпісанне пагаднення паміж БДУ і Цюменскім універсітэтам – 21.by (13.01).

Пра стварэнне новай саюзнай суперкамп'ютарнай праграмы – «Советская Белоруссия» (13.01).

Размова з дырэктарам Інстытута журналістыкі БДУ Сяргеем Дубовікам – «Советская Белоруссия» (13.01).

Адкрыццё кабінета чэшскай філалогіі – «Минск-Новости» (11.01); 21.by (12.01); «Народная газета» (13.01); БелТА (13.01); tut.by (13.01); «Рэспубліка» (14.01); «Знамя юности» (14.01).

Распрацоўкі навукоўцаў НДІ ПФП БДУ – «Настаўніцкая газета» (11.01).

Пра заалагічны музей БДУ – «Знамя юности» (06.01).

Выкладчык Інстытута журналістыкі БДУ Маргарыта Аляшкевіч пра тое, якой павінна быць дзіцячая кніжка – ЛіМ (06.01).

Навукова-практычная канферэнцыя сярод школьнікаў, прысвечаная хрысціянскай маралі – «Минск-Новости» (05.01); БелаПАН (05.01); 21.by (05.01); naviny.by (05.01).

Дэкан эканамічнага факультэта Міхаіл Кавалёў каментуе дамовы па ЕЭП, дырэктыву №4, «паводзіны» долара – «Советская Белоруссия» (04.01); «Звязда» (06.01; 13.01).

У абсерваторыі БДУ каментуюць навагодні зарапад, сонечнае зацьменне – БелТА (31.12; 03.01); sb.by (02.01); БелаПАН (03.01); naviny.by (03.01).

Дні адчыненых дзвярэй у БДУ – «Комсомольская правда в Белоруссии» (27.12); БелаПАН (03.01); 21.by (03.01); «Звязда»/»Чырвоная змена» (19.01).

Пра дадатак еўрапейскага ўзору да дыплома БДУ – «Советская Белоруссия» (24.12); «Гродненская правда» (05.01).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

НАВУКОВЫ ІНТАРЭС

АСПІРАНТУРА F.A.Q.

(Што вы хацелі і баяліся спытацца)

Аспіранты ўяўляліся мне гэткімі светлымі істотамі, сатканымі з ведаў і энтузіязму. Не, хлушу, раней мне аспіранты не ўяўляліся ніяк, бо па заканчэнні ВНУ марыла пайсці нарэшце зарабляць свой першы трыльён. Аж цяпер сама сярод аспірантаў – і магу вам сказаць, што гэты народ таксама есць, спіць ды іншыя жыццёвыя патрэбы мае. Напрыклад, хоча добрага заробку і трохпакаёўку ў цэнтры. Універсітэт намагаецца падтрымліваць маладую навуку, дык і мы вырашылі свой язык у тую кашу ўтыркнуць – распачынаем цыкл матэрыялаў пра аспірантуру і аспірантаў. Напачатку – агульны агляд ключавых момантаў.

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

Канстанцін КАРОСЦІК

КОЛЬКІ КАГО?

План прыёму ў аспірантуру сёння каля 200 чалавек (бюджэт). На платнай аснове набіраецца 20 чалавек штогод. Зараз у аспірантуры БДУ за свае кроўныя вучыцца 58 грамадзян Беларусі. Усяго адкрыта 118 спецыяльнасцяў (і 45 у дактарантуры). Зразумела, не кожны год усе спецыяльнасці запаўняюцца – сёлета прынялі аспірантаў па 77 спецыяльнасцях. Навучанне на вочнай форме тры гады, на завочнай – чатыры.

Апошнія два гады план прыёму выконваецца на ўсе 100 %. Хаця гэта і няпроста.

Упраўленне падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі (УПКВК) намагаецца не толькі выконваць план, але і ўдасканальваць пры гэтым структуру падрыхтоўкі. Упраўленне для аспірантаў, дарэчы, калі не родны кут, дык прынамсі надзейнае апірышча. Не раз даводзілася назіраць, як маладзёны прыходзілі на Бабруйскую, 9 са слязамі на вачах, а сыходзілі супакоеныя.

ЯК ПАТРАПІЦЬ?

Коратка: трэба падрыхтаваць стос дакументаў і здаць уступныя іспыты. Тыя, хто навучаўся ў магістратуры, здаюць толькі адзін іспыт – па спецыяльнасці, бо астатнія дысцыпліны ўваходзяць у вучэбны план магістратуры.

Здольных да навукі студэнтаў рэкамендуюць у аспірантуру факультэты.

Каб падрыхтаваць і абараніць дысертацыю, аспірант павінен мець мінімум тры артыкулы ў навуковых часопісах, якія ўваходзяць у пералік выданняў, зацверджаных ВАК. Апрача таго, павінны быць апублікаваны тэзісы дакладаў як вынік апрабацыі аспірантам свайго даследавання на канферэнцыях.

І, само сабой, трэба напісаць дысертацыю. А потым адрасціць тоўстую скуру і пачынаць наступ – больш вядомы пад назвай «абарона».

ПРАЦЭДУРА АТЭСТАЦЫІ

Дысертацыя, падрыхтаваная аспірантам або суіскальнікам, спярша павінна быць разгледжана на кафедры – гэта:

1) першапачатковы разгляд дысертацыі. Найлепшы час для яе – вясна апошняга года навучання, калі да завяршэння аспірантуры застаецца яшчэ паўгода і можна тое-сёе паспець падправіць. Пасля чакае:

2) папярэдняя экспертыза. Зазвычай яна адбываецца напрыканцы навучання ў аспірантуры з удзелам камісіі. Дысертант робіць даклад, праходзіць абмеркаванне, і яму выдаецца заключэнне, зацверджанае прарэктарам па навуковай працы. Затым ён праходзіць:

3) семінар у апаніруючай арганізацыі;

4) рассылае рэферат у абавязковыя арганізацыі, а таксама на свой выбар, збірае водгукі на даследаванне;

5) атрымлівае заключэнне навуковага кіраўніка і разам з заключэннем папярэдняй экспертызы прадстаўляе дакументы ў савет па абароне дысертацый, які прызначае эксперта для правядзення:

6) першаснай экспертызы дысертацыі. Зноў семінар, зноў даклад, абмеркаванне. Савет прызначае дату абароны, пра што паведамляецца на сайце ВАКа. На абарону можа прыйсці любы чалавек, задаць пытанні.

Працэдура:

7) публічнай абароны дысертацыі падрабязна распісана ў Палажэнні аб прысуджэнні вучоных ступеняў літаральна па кожным кроку. Затым адбываецца тайнае галасаванне, абвяшчаюцца яго вынікі. Пазней фарміруецца асабістая справа па гэтай дысертацыі і накіроўваецца ў адпаведны аддзел ВАКа, які зноў разглядае дысертацыю і рыхтуе:

8) прапанову Прэзідыума ВАКа аб зацвярджэнні.

МЭТАВІКІ – ГЭТА ХТО?

Сёлета каля 30 % аспірантаў прынята па накіраваннях. Частка з іх прыйшла з установ і арганізацый, якія не належаць да Міністэрства адукацыі, іншая частка – з розных ВНУ і іншых адукацыйных устаноў краіны. Праблемы ў «мэтавікаў» агульныя: узровень падрыхтоўкі выпускнікоў перыферыйных ВНУ ніжэйшы, чым у выпускнікоў БДУ, існуюць разыходжанні ў праграмах. Мэтавая аспірантура патрабуе ўдасканалення – пра што начальнік УПКВК Канстанцін КАРОСЦІК пісаў Міністэрству адукацыі ў дзень нашай размовы, рыхтуючы справаздачу аб глабальных праблемах адукацыі. Прапанавана, каб установы і арганізацыі вызначыліся з кандыдатурамі будучых аспірантаў не пазней чым за год да меркаванага паступлення. Тыя, хто збіраецца ў аспірантуру, павінны пачаць узаемадзеянне з БДУ, пабываць на адпаведных кафедрах, можа нават паслухаць курсы, якія ў іх не чытаюцца.

Яшчэ адна праблема з мэтавым наборам – няпэўнасць. Установы і арганізацыі паведамляюць БДУ, што плануюць адправіць у аспірантуру чалавека. Яго ўносяць у план, а за год гэты чалавек можа звольніцца, пайсці ў адпачынак, з'ехаць. Даводзіцца кагосьці шукаць на яго месца, бо план жа трэба выконваць.

Сп. Каросцік распавядае: «Дзяржаўны мытны камітэт хацеў накіраваць да нас супрацоўнікаў, а яны не з'явіліся. Давялося тэлефанаваць генералу, намесніку, тлумачыць сітуацыю. На што мне кажуць: «Канстанцін Мікалаевіч, калі Вы загадаеце нашым палкоўнікам з'явіцца праз дзесяць хвілін, яны запыхаюцца, але прыбягуць...» У гэтым выпадку ваенная дысцыпліна выратавала. А ёсць, напрыклад, Мінпрам з арганізацыямі кшталту «Інтэграла» – дабіцца ад іх, каб адшукалі зніклага «мэтавіка», вельмі складана. Тэлефаную намесніку генеральнага дырэктара – а гэта ўжо не той чалавек, які вярстаў планы, а новы, ён і ведаць нічога не ведае».

ШТО ЗА НУЛЁЎКА – МАГІСТРАТУРА?

БДУ арыентуе на тое, каб у аспірантуру ішло паболей тых, хто скончыў магістратуру. У 2010 г. у аспірантуру прынялі каля 88 % магістраў. Магчыма, гады праз 3–4 у аспірантуру будуць паступаць толькі праз магістратуру. Удакладняем у Канстанціна Мікалаевіча:

– Хіба магістратура раней не была абавязковай для тых, хто збіраўся стаць аспірантам?

– Не, гэтага ніколі не было. Было нават вырашана, што пры ўвядзенні падобнай умовы яшчэ недзе год-два будзем прымаць па-старому. Бо ёсць даследчыкі, здатныя і без магістратуры зрабіць дысертацыю.

ГЭТА Ў ПРЫНЦЫПЕ РЭАЛЬНА???

За тры гады падрыхтаваць дысертацыю сапраўды вельмі няпроста. Асабліва па некаторых спецыяльнасцях. На працягу апошніх чатырох гадоў у БДУ расце колькасць дысертацый, абароненых у тэрмін. У 2007 г. – 7,3 %, 2008 – 8,9 %, 2009 – 13,2 %, 2010 – 16,8 %! То бок за гэты час эфектыўнасць аспірантуры павялічылася больш чым у два разы. Каб зразумець, наколькі добры гэты паказчык, зірнём на сітуацыю ў іншых установах: па нашых звестках, у НАН РБ дысертацый, абароненых у тэрмін летась, было крыху болей за 2 %, па Міністэрстве адукацыі без БДУ доля своечасовых абарон складае 5–6 % ад усёй колькасці.

НАКОРМЯЦЬ?

У БДУ распрацавана разгалінаваная сістэма стымулявання дзейнасці аспірантаў. Яна ўключае фінансавую падтрымку і арганізацыйна-метадычную работу ўпраўлення падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

Найперш, існуе конкурс грантаў БДУ. У мінулым годзе на яго было пададзена 40 праектаў, з іх прафінансавана 29. На гэтыя мэты выдаткавана 105 млн руб. з пазабюджэтных сродкаў БДУ.

Затым, праводзіцца конкурс для арганізатараў і кіраўнікоў НДР студэнтаў і аспірантаў. Выяўляюцца пераможцы ў намінацыях «індывідуальнае кіраўніцтва», «кіраўніцтва моладзевым навуковым аб'яднаннем», «папулярызацыя навукі сярод студэнцкай моладзі і школьнікаў», «асабісты ўклад у арганізацыю НДР студэнтаў і аспірантаў у падраздзяленнях», «падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі» (прэміруюцца асобы, якія займаліся НДРС, потым заахвоцілі гэтых студэнтаў паступіць у аспірантуру і кіравалі да паспяховай абароны дысертацыі). У 2010 г. на гэты конкурс пайшло 11 млн 40 тыс. руб.

З 2004 г. аспірантаў, суіскальнікаў і іх навуковых кіраўнікоў прэміруюць за абарону дысертацый. Гэта цэлая сістэма: самая вялікая сума дастаецца тым, хто абараняецца ў тэрмін – 16 базавых велічынь атрымлівае кіраўнік, 12 – сам аспірант. Супрацоўнікам БДУ за абарону кандыдацкай дысертацыі таксама дастаецца: 8 базавых – кіраўніку, 7 – будучаму кандыдату навук. Юрыдычныя асобы ў складзе БДУ зараз маюць права прэміраваць сваіх супрацоўнікаў па-свойму, з уласных сродкаў, могуць самі вызначаць памер прэмій і тэрмін выплат.

Прадугледжана таксама бюджэтнае прэміраванне за плённую навуковую дзейнасць аспірантаў – штомесячная надбаўка тым, хто асабліва шчыруе ў навуцы.

Але чамусьці самыя-самыя – пераможцы рэспубліканскіх конкурсаў, лаўрэаты імянных стыпендый – у аспірантуру ідуць не ўсе. Знаходзяць прывабную працу на фірмах (дзе ты, дзе ты, першы трыльён?). У 2006 г. ад такіх выпускнікоў пайшло ў аспірантуру каля 80 %, а ў 2009–2010 гг. працэнт знізіўся да 30... Гэту праблему не вырашыць без павелічэння бюджэтнага фінансавання навукі, без карэнных зменаў у стаўленні да навуковай дзейнасці.

НЕ МАГУ САБРАЦЦА, АРГАНІЗАВАЦЬ СВАЮ ПРАЦУ

Кантроль і стымуляванне аспірантаў у БДУ рознабаковыя. Штогод праводзіцца прамежкавая атэстацыя аспірантаў. Камісія з УПКВК наведвае факультэты, дзе праводзіцца сумоўе з кожным аспірантам: ён дае справаздачу, як ідзе ягонае даследаванне, што з публікацыямі, ці ёсць праблемы. Яны павінны быць вырашаны на працягу года, да гадавой атэстацыі. Калі не – робяцца адпаведныя захады, ажно да адлічэння аспіранта.

Нядаўна распрацавана Палажэнне аб парадку праходжання экспертызы дысертацыйных матэрыялаў і працэдуры абароны дысертацыі ў БДУ. Яно ўзгоднена з ВАКам, уведзена 26 лістапада 2010 г. і дзейнічае ў рамках рэспубліканскага Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў (пазнаёміцца з Палажэннем можна на сайце БДУ: раздзел Навука, падраздзел Атэстацыя кадраў вышэйшай кваліфікацыі).

Рэгулярна праводзіцца канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў БДУ – у 2010 г. працавала 240 секцый, было зроблена 3248 дакладаў. Па матэрыялах канферэнцыі рыхтуецца зборнік – з гэтага года ён зноў будзе друкавацца на паперы. Для маладых даследчыкаў часта з першай публікацыі і пачынаецца шлях у навуку.

НЕ ХАЧУ Ў АСПІРАНТУРУ, АЛЕ ХАЧУ СТУПЕНЬ

Суіскальніцтва – яшчэ адна форма падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі: чалавек праходзіць сумоўе ў пэўным падраздзяленні БДУ, на кафедры, фармулюе тэму дысертацыйнага даследавання; на вучоным савеце прымаецца рашэнне аб залічэнні яго ў якасці суіскальніка, прызначаецца кіраўнік. Падрыхтоўка для тых, хто не з'яўляецца супрацоўнікамі БДУ, ажыццяўляецца на платнай аснове.

ЗАМЕЖНІКАЎ БЯРУЦЬ?

Доля замежных грамадзян сярод навучэнцаў аспірантуры апошнія гады расце. У 2005 г. іх было 24, у 2006 ужо 37, 2007 – 65 чалавек, 2008 – ажно 83, апошнія два гады прымалі па 84 замежныя аспіранты з 14 краін (больш за ўсё з Кітая – 31 чалавек). Затым Ірак, Іран, Лівія... Найчасцей яны спачатку заканчваюць магістратуру, каб падвучыць мову. Патрабаванні да ўсіх аспірантаў аднолькавыя. Нядбайных аспірантаў-замежнікаў таксама адлічваюць – прэстыж універсітэта, аднак.

А КАЛІ Я ХАЧУ ВУЧЫЦЦА ЗА МЯЖОЙ?

У 2005 г. падпісана пагадненне з Харбінскім універсітэтам навукі і тэхналогій (Кітай) аб стварэнні сумеснай аспірантуры. У першы год набралі 8, у другі 7 кітайцаў. З першых васьмі ажно шэсць абаранілі дысертацыі. БДУ таксама можа накіроўваць аспірантаў у ХУНТ. Але пакуль што не накіроўваў.

У 2010 г. пагадненне аб сумеснай аспірантуры падпісана і з Далянскім політэхнічным інстытутам (у той жа КНР). Калі вам туды, то калі ласка.

Я Ў ТЭРМІН НЕ АБАРАНЮСЯ

Абараніцца ў тэрмін можна. Ёсць нават асобы, якім удавалася абараніцца датэрмінова. Важна рана пачаць (гэтак курсе на трэцім), рацыянальна размеркаваць свае высілкі, засяродзіцца на дысертацыі ў аспірантуры. Бо тым, хто ў час абараняецца, і стаўленне асаблівае, і даплаты, і шлях у навуку.

А вось калі зацягнеце, не абароніцеся цягам гадоў пяці–шасці па завяршэнні аспірантуры – пішы прапала: па назіраннях супрацоўнікаў УПКВК, за такі доўгі час цікавасць да навукі выхалоджваецца цалкам.

Ёсць аб'ектыўныя цяжкасці: напрыклад, у геолагаў, географаў, біёлагаў і іншых прыродазнаўцаў збор матэрыялу патрабуе часу, пэўнага збегу абставін. Але найчасцей паспяховай абароне замінаюць цяжкасці суб'ектыўнага характару, а менавіта – гультаяватасць ці несабранасць самога аспіранта. Хто сапраўды хоча абараніцца, звычайна спраўляецца.

АСПІРАНТУРУ СКОНЧЫЛІ. ШТО ДАЛЕЙ?

Пункцік першага трыльёна, з-за якога многія думаць не думаюць пра аспірантуру, – праблема прывабнасці працы навукоўцаў. Праблема, можна сказаць, нацыянальная. Калі будзе адпаведнае фінансаванне, адэкватны заробак для навукоўца, тады найлепшыя з выпускнікоў з ахвотай пойдуць у аспірантуру. Мусіць паспрыяць гэтаму і нядаўна прыняты Кодэкс аб адукацыі.

У наступных нумарах газеты якраз і пагаворым пра новаўвядзенні, важныя для тых, хто скончыў аспірантуру.

Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ

АСОБЫ

З ПЕРШЫХ ДЗЁН РАЗАМ З ЖУРФАКАМ

Да дня нараджэння Ніны Аляксандраўны СНІЦАРАВАЙ супрацоўнікі кафедры гісторыі журналістыкі выпусцілі насценгазету з віншаваннямі, якую ёй і падаравалі. Ім прыйшлося пастараца, каб побач са сваімі ўжо «сталымі» фатаграфіямі размясціць ружовыя сардэчкі з прызнаннямі ў пачуццях да сваёй калегі. Адно з такіх цёплых выказванняў сведчыць: «Ніна Аляксандраўна – недасягальны ідэал журналістыкі». І гэта зразумела. Дацэнт кандыдат філалагічных навук Н.А. Сніцарава калісьці для многіх з іх была выкладчыцай, бо яе жыццё звязана з факультэтам журналістыкі больш за 65 гадоў.

Ніна Аляксандраўна прыйшла на факультэт журналістыкі адразу пасля вайны ў 1944 годзе, як толькі той пачаў стварацца. Тады ёй, яшчэ маладой дзяўчыне, патрапіла на вочы аб'ява, што на спецыяльныя трохмесячныя курсы набіраюцца слухачы з сямю класамі за плячыма. Гэта дало ёй магчымасць паступіць ва ўніверсітэт.

Вельмі рамантычным здавалася гэта слова – журналістыка! Яно набліжала яе да літаратуры, якая цікавіла яшчэ з дзяцінства. Аднак першая камандзіроўка падчас практыкі ў газеце «Советская Белоруссия» ў разбураныя вайной калгасы Палесся паказала, што рамантыка журналістыкі часта губляецца ў жыццёвых абставінах. Тым не менш Ніна Аляксандраўна, як і многія іншыя студэнты з яе курса, старалася навучыцца гэтай справе як мага лепш. Універсітэцкая бібліятэка тады толькі стваралася, патрэбныя кнігі адшукваліся з вялікай цяжкасцю, заняткі праходзілі ў сямі розных школьных будынках. Ды і выкладчыкаў не хапала. Ніна Аляксандраўна памятае, як яны ўсім курсам – а гэта за 20 чалавек – былі запрошаны ў Маскву. І вось іх, журналістаў-пачаткоўцаў, прымаюць у рэдакцыі «Правды». Вядомы тады сатырык і фельетаніст Давід Заслаўскі пытаецца ў беларускіх студэнтаў: «Хто ў вас чытае тэорыю і практыку друку?» Яны адказваюць: «Марк Саламонавіч Зярніцкі». Ён не спыняецца: «А хто ў вас вядзе практыку?» Тыя зноў жа гавораць: «Марк Саламонавіч Зярніцкі». «Цяжкае ў вас становішча. Але яго трэба неяк выпраўляць», – зазначыў знакаміты маскоўскі журналіст.

Напачатку навучання журналісцкія дысцыпліны на факультэце ў Мінску вялі ўсяго два выкладчыкі, а вось літаратуру і гісторыю прыязджалі чытаць лектары нават з Маскоўскага ўніверсітэта. «У першыя гады свайго існавання факультэт журналістыкі БДУ выпусціў вельмі добра літаратурна адукаваных людзей, – расказвае Ніна Аляксандраўна. – Многія з іх пайшлі працаваць у газеты, асобныя сталі пісьменнікамі і паэтамі».

Ніну Аляксандраўну, як выдатніцу, пасля заканчэння факультэта накіравалі ў аспірантуру ў Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт. І з гэтага часу яе навуковыя інтарэсы цесна перапляталіся з гісторыяй журналістыкі. Літаратура ж увайшла ў яе асабістае жыццё. Ніна Аляксандраўна пэўны час была звязана роднаснымі адносінамі з сям'ёй Янкі Маўра і можа засведчыць, што гэта быў вельмі адукаваны чалавек з выдатным пачуццём гумару. «Палескія рабінзоны» сталі любімай кнігай для яе старэйшага сына Андрэя, унука вядомага пісьменніка. Ніне Аляксандраўне пашчасціла мець блізкае знаёмства з такімі класікамі беларускай літаратуры, як Якуб Колас, Міхась Лынькоў, Максім Танк, Аркадзь Куляшоў.

На лекцыях па гісторыі журналістыкі яна часта расказвала студэнтам пра многіх вядомых расійскіх пісьменнікаў і паэтаў XVII–XIX стст. Іх літаратурная дзейнасць у той час была цесна звязана з жыццём, што падштурхоўвала да публіцыстычнага асэнсавання грамадскіх з'яў. Яна заўсёды імкнулася прадэманстраваць маладым людзям, што літаратура таго часу можа даць сучаснаму журналісту. На яе думку, многія рэчы, найбольш важныя, застаюцца нязменнымі, аднак гістарычная рэчаіснасць патрабуе новага ўсведамлення. У свой час яе так зацікавіла творчасць вядомага пісьменніка-сатырыка М. Салтыкова-Шчадрына, што тэмай сваіх дысертацыйных даследаванняў яна выбрала час яго публіцыстычнай дзейнасці і рэдактарства ў часопісе «Отечественные записки». А потым зачытвала цэлыя старонкі з яго артыкулаў перад аўдыторыяй, і студэнты пачыналі разумець, наколькі назіранні публіцыста мінулага сугучныя з сучаснасцю.

Калі Ніне Аляксандраўне гавораць, як добра яна выглядае ў свае 85 гадоў, то тая адказвае, што гэта прамая заслуга моладзі: «Я павінна была адпавядаць іх светаўспрыманню і заўсёды старалася зразумець студэнтаў і быць зразуметай імі». Кожны новы студэнцкі курс вучыў яе па-новаму ўспрымаць рэчаіснасць. Яна магла згаджацца са студэнтамі, магла не згаджацца, аднак ёй заўсёды было цікава працаваць з імі. У Ніны Аляксандраўны часта цікавяцца, чым цяперашнія студэнты адрозніваюцца ад ранейшых. «Тэхнічны прагрэс, зразумела, дае шмат магчымасцяў. Але для выкладчыкаў ён прыносіць і нямала клопатаў», – жартуе яна ў адказ. Ніна Аляксандраўна заўсёды ведае, спісаў студэнт курсавую работу ў інтэрнэце ці зрабіў самастойнае даследаванне, але хоча, каб гэта бачыў і ён і вучыўся ўменню выказваць уласныя думкі. Журналістыка для яе не толькі спосаб перадачы інфармацыі – гэта магчымасць выказаць сваё бачанне і выклікаць адпаведную рэакцыю ў чытача. Ёй блізкія людзі, якія смела карыстаюцца пяром.

Ганна ЛАГУН

ІНАВАЦЫІ

Эфект, параўнальны з палётам на Месяц

На моладзевым інавацыйным форуме «ІНТРЫ»–2010 у ліку праектаў маладых фізікаў, хімікаў, матэматыкаў і біёлагаў былі прадстаўлены і два праекты будучых менеджараў.

Маладыя наватары з эканамічнага факультэта БДУ

Прынята лічыць, што інавацыі звязаны ў большай ступені з матэрыяльнай вытворчасцю і прыродазнаўчымі навукамі. Аднак арганізацыйныя інавацыі, накіраваныя на развіццё інфраструктуры эканомікі, на павышэнне якасці кіравання, на новыя падыходы да вырашэння сацыяльных і эканамічных праблем могуць даць эфект, параўнальны з палётам на Месяц. Да прыкладу, на конкурсе па скарачэнні аўтамабільных выкідаў у адным з японскіх гарадоў перамога была прысуджана не вынаходнікам электрамабіляў, а менеджарам, якія прапанавалі простыя арганізацыйныя схемы сумесных паездак на асабістых аўтамабілях, што знізіла транспартны паток больш чым у два разы.

Арганізацыйныя інавацыі сёння асабліва актуальныя, таму што яны накіраваны на вырашэнне дзвюх найважнейшых задач інавацыйнага развіцця: развіцця прадукцыйных сіл – «кадры» і фарміравання ўмоў – «бізнес-асяроддзя» для эфектыўнага выкарыстання тэхналагічных навінак.

Студэнты эканамічнага факультэта А. Ананіч, М. Сяховіч, К. Кавалёва, Т. Кардаш і малады выкладчык кафедры менеджменту І. Кірсанава прадставілі на форуме «ІНТРЫ»–2010 праект «Цэнтра дзелавых паслуг для малога бізнесу», які дазволіць прадпрымальнікам хутчэй пераадольваць інфармацыйныя і арганізацыйныя бар'еры за кошт аператыўнага атрымання інфармацыйных і кансалтынгавых паслуг па ўмовах вядзення бізнесу, пачынаючы са стварэння прадпрыемства і заканчваючы яго ўдзелам у дзяржаўных закупках.

Малы бізнес у Беларусі развіваецца паспхова. Яго доля ў даходнай частцы бюджэту складае 19,5 %. Малы і сярэдні бізнес больш успрымальныя да інавацый і хутчэй да іх адаптуюцца. У Беларусі ў найбліжэйшай перспектыве павінна быць дадаткова створана 50–55 тыс. малых прадпрыемстваў, у першую чаргу ў вытворчай сферы і сферы паслуг. Таму спатрэбіцца стварэнне структур, якія выкарыстоўваюць інавацыйныя падыходы кансультацыйнай падтрымкі малога бізнесу. Прынцыповае адрозненне праекта «Цэнтр дзелавых паслуг для малога бізнесу» складаецца ў комплексным і «бюджэтаэканомным» падыходзе да фарміравання інфармацыйнага рэсурсу ў выглядзе рэспубліканскага мегапартала ва ўзаемадзеянні з існуючымі інфармацыйнымі цэнтрамі і сайтамі для падтрымкі прадпрымальніцтва і аказання інфармацыйна-кансалтынгавых паслуг па прынцыпе «аднаго акна». Гэты студэнцкі праект прадстаўлены на грант Міністэрства адукацыі Беларусі.

Другі праект, прадстаўлены маладымі навукоўцамі эканамічнага факультэта М. Андрыянчыкавай і В. Анціпавай і геаграфічнага факультэта С. Дзям'янавым і А. Сарокіным, прысвечаны праектна-каманднаму падыходу для стварэння ланцужка «праект – студэнт – прадпрыемства». Гэтая арганізацыйная інавацыя накіравана на развіццё чалавечага патэнцыялу, ініцыятывы і моладзевага прадпрымальніцтва ў сельскай мясцовасці. У свой час вялікі французскі мысляр Жан-Жак Русо сказаў, што калі гандаль дае дзяржаве багацце, то сельская гаспадарка дае свабоду.

У нашай краіне паспяхова вырашаны праблемы развіцця аграпрамысловага комплексу. Забяспечаны самы высокі ў краінах СНД узровень харчовай бяспекі, экспартуецца значная частка сельгаспрадукцыі. Зараз паслядоўна рэалізуюцца мерапрыемствы па развіцці сельскіх тэрыторый: ствараюцца аграгарадкі і добраўпарадкуюцца сельскія тэрыторыі (шляхам стварэння новых вытворчасцяў і пашырэння відаў паслуг з улікам попыту насельніцтва і мясцовых асаблівасцяў). Праблема заключаецца ў тым, што малады спецыяліст прыходзіць на сяло наёмным работнікам з перспектывай толькі на 2 гады. Таму неабходна стварыць умовы для самастойнага фарміравання сённяшнімі студэнтамі доўгатэрміновых прадпрымальніцкіх праектаў і далейшага развіцця гэтых праектаў у сельскай мясцовасці.

Нашы маладыя навукоўцы прапанавалі арганізаваць сумесную распрацоўку будучымі спецыялістамі (пажадана, каб гэта былі студэнты-землякі), пачынаючы з 3-га курса, праекта, прызначанага для рэалізацыі ў канкрэтнай сельскай мясцовасці, з наступнай рэгулярнай камандной абаронай асноўных палажэнняў праекта аж да абароны дыплома і яго адабрэння мясцовай адміністрацыяй. Такім чынам, будзе фарміравацца ланцужок «праект – студэнт – прадпрыемства», што надасць падрыхтоўцы спецыялістаў для сельскай мясцовасці неабходную канкрэтыку ў засваенні інавацый, рэалізацыі ўласных бізнес-праектаў і сістэму матывацый, у тым ліку і шляхам фінансавай падтрымкі студэнцкіх праектаў. Гэты праект таксама падзены на грант Міністэрства адукацыі.

У Беларусі актыўна ідзе пошук новых ідэй далейшага сацыяльна-эканамічнага развіцця, стварэння інавацыйных вытворчасцяў, росту экспарту, пастаяннага павышэння якасці жыцця насельніцтва. Будуць ствараца адпаведныя вытворча-эканамічныя структуры, фарміравацца новыя падыходы кіравання рознымі звёнамі народнай гаспадаркі. Як вынік, узрастае попыт на менеджараў-інаватараў, якія могуць не толькі асвойваць перадавыя кіраўніцкія тэхналогіі, але і самастойна ствараць прынцыпова новыя. Такія, якія дазволілі б Беларусі быць у авангардзе новага індустрыяльнага вітка развіцця.

Удзел менеджараў-эканамістаў у моладзевым інавацыйным форуме з'яўляецца прызнаннем таго, што маладыя кіраўнікі здольныя ўсведамляць сучасныя кіраўніцкія праблемы і прапаноўваць інавацыйныя метады іх вырашэння.

Прафесар Барыс ПАНЬШЫН,
загадчык кафедры менеджменту

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ ЎНІВЕРСІЯДА: БРОНЗА – ЯК ЗОЛАТА

Паводле вынікаў фінальных спаборніцтваў Рэспубліканскай універсіяды–2010 Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт заняў трэцяе агульнае месца сярод ВНУ першай групы (дзе здзяйсняецца навучанне студэнтаў па спецыяльнасці «Фізічная культура і спорт» і на дзённай форме налічваецца больш за 15 тыс. студэнтаў). Наконт апошняга поспеху, яго перадумоў, інфраструктуры, стану здароўя нашых студэнтаў і не толькі падзяліўся сваімі думкамі загадчык кафедры фізвыхавання і спорту БДУ Віктар КАЛЯДА.

Віктар Каляда (другі справа) разам з супрацоўнікамі кафедры

– Віктар Антонавіч, віншуем Вас і ўсю кафедру фізвыхавання і спорту БДУ з поспехам на Рэспубліканскай універсіядзе. Але трэцяе месца не першае. Падзялімцеся сваімі ўражаннямі, і ці задаволены Вы вынікамі?

– Раней мы ўжо займалі трэцяе месца, але трэба мець на ўвазе, у якіх абставінах праходзіла сёлетняя ўніверсіяда.

Увогуле 54 ВНУ краіны расфарміроўваюцца на 4 групы. Дагэтуль мы былі ў іншай групе, але, дзякуючы высокім вынікам, якія паказваў наш універсітэт цягам апошніх гадоў, мы перайшлі ў наймацнейшую першую групу. Апрача БДУ, у ёй Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры, БНТУ, Гродзенскі, Магілёўскі, Гомельскі, Брэсцкі, Віцебскі, Полацкі дзяржаўныя ўніверсітэты і два педагагічныя: Беларускі дзяржаўны і Мазырскі дзяржаўны. Ва ўсіх пералічаных навучальных установах, за выключэннем нашай, ёсць спецыялізаваныя факультэты фізвыхавання.

Універсітэт фізічнай культуры рыхтуе прафесійных спартоўцаў. Спаборнічаць з імі – тое ж самае, што ім жа выстаўляць сваіх студэнтаў на алімпіяду па матэматыцы супраць мехмата. На базе БНТУ больш за 20 гульнявых закрытых залаў, у якіх трэніруюцца многія нашы нацыянальныя зборныя, басейн на 50 метраў. У нас толькі адна гульнявая зала адпаведнага ўзроўню. Але, нягледзячы на ўсе гэтыя чыннікі, наш універсітэт заняў трэцяе месца. Сапраўды, вялікі поспех.

– Выступленні ў якіх відах Вы б маглі адзначыць?

– У БДУФК ёсць кафедра лыжнага спорту, якая рыхтуе прафесійных лыжнікаў. А мы ўзялі ды занялі першае месца ў лыжных гонках (адказная за від Людміла Капылова).

Сталі першымі таксама ў гірах (Уладзімір Фралоў) і ў армрэстлінгу (Віктар Кавалёў).

Занялі другія месцы ў шахматах (Анатоль Кудзін), спартыўным арыентаванні (Віктар Красільнікаў, Сяргей Астраўляньчык), у спартыўнай аэробіцы ўвогуле падзялілі першае месца з БДУФК (Валянціна Сеўба).

Сталі бронзавымі прызёрамі ў зімовым мнагаборстве (Людміла Капылова), веласіпедным спорце (Віктар Пятроўскі), каратэ (Леанід Лушчык).

Асобна хацелася б сказаць пра нашых валейбалістаў, якія таксама ўзялі бронзу ўпершыню за апошнія дзесяць гадоў (адказны – дацэнт Іван Шыраеў).

Не магу абысці ўвагай нашых дзяўчат, што занялі чацвёртае месца ў вольнай барацьбе, і біятланістаў, якія таксама спыніліся ў адным кроку ад медалёў, і гэта пры тым, што ў нас няма ўласных ціраў і вінтовак, іх мы вымушаны арандаваць.

На працягу доўгага часу не вырашалася пытанне пра ўключэнне ў праграму ўніверсіяды армрэстлінгу, гіравога спорту, паўэрліфтынгу – нашых ключавых відаў. Акурат перад выступленнямі іх унеслі.

Не ўдзельнічалі мы толькі ў спаборніцтвах па грэблі на байдарках і каноэ і ў боксе.

– Дзякуючы чаму дасягнуты такія высокі вынікі? Што стала асновай нашага поспеху?

– Толькі дзякуючы сумесным намаганням усяго калектыву, разам з дапамогай грамадскіх арганізацый. Усе вельмі адказна паставіліся да спаборніцтваў.

Асобная падзяка рэктарату, студгарадку, усім факультэтам, асабліва юрыстам, гісторыкам, мехматаўцам, шахматыстам з ФПМІ, біёлагам – усім без выключэння.

– Ці не звязваеце Вы гэты поспех з адкрыццём комплексу «Універсітэцкі»? Як увогуле сітуацыя з інфраструктурай, без наяўнасці якой дасягненне найвышэйшых месцаў на спаборніцтвах, сапраўды, складаная задача?

– Паводле нормаў для заняткаў спортам, аднаму чалавеку патрэбны адзін квадратны метр у закрытых памяшканнях і два – у адкрытых. У нас займаюцца каля 13 тыс. студэнтаў. Агульная плошча закрытых спартыўных збудаванняў, што ёсць у нас, складае ўсяго 6 250,9 м², а адкрытых – 14 295, з іх 11 895 прыпадаюць на згаданы вамі «Універсітэцкі», які ўключае стадыён са штучным пакрыццём, басейн, спартыўныя залы з сучасным абсталяваннем, інвентаром, трэнажорамі. Комплекс і так працуе ў рэжыме перавышанай нагрузкі, але і гэтага недастаткова. Дарэчы, праз платныя паслугі на ягонай базе існуе магчымасць для кожнага гараджаніна задаволіць свае спартыўныя патрэбы.

Усяго ва ўніверсітэце 27 закрытых залаў, з якіх 7 прыстасаваны для заняткаў фізічнай культурай і спортам. Хаця для многіх ВНУ нашай краіны гэтая праблема яшчэ больш вострая.

Таксама за кошт арэнды некаторых гарадскіх аб'ектаў мы выкарыстоўваем усе магчымасці для заняткаў студэнтаў, але і гэта пакуль што не можа задаволіць усіх патрэбаў нашай ВНУ.

Нядаўна прайшоў экспертызу запланаваны для будаўніцтва манеж у Шчомысліцы, што дапаможа вырашыць праблему адсутнасці адпаведных нормам аб'ектаў на тэрыторыі філіяла БДУ, у якім месцяцца тры нашы факультэты (біялагічны, гуманітарны і факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій).

На кафедры фізвыхавання і спорту БДУ працуюць 120 чалавек, сярод якіх 3 прафесары, 2 доктары, 8 кандыдатаў, 11 заслужаных трэнераў і больш за 60 майстроў спорту. Навучальны працэс па дысцыпліне «Фізічная культура» здзяйсняецца на 16 факультэтах універсітэта і ў двух інстытутах. Да таго, кафедра вядзе 108 груп спартыўнага ўдасканалення па 24 відах, у якіх займаюцца каля 1300 студэнтаў.

Зразумела, што калі няма спартыўнай базы, то і не будзе ў нашай моладзі зацікаўленасці фізічнай культурай і спортам.

– Што, безумоўна, уплывае на стан здароўя. Калі я вучыўся ў школе, у маім класе сярод усіх хлопцаў быў толькі адзін чалавек з асноўнай групы. А што адносна нашых студэнтаў? Калі існуе такая праблема, якія шляхі Вы можаце прапанаваць для паляпшэння сітуацыі?

– Найбольш эфектыўна клапаціцца пра здароўе студэнтаў магчыма толькі пры дапамозе кваліфікаванага медыцынскага супрацоўніка, які павінен уваходзіць у склад кафедры фізвыхавання. Згодна з пастановай галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Беларусі №100, гэта пасада прадугледжана, але на справе не ўводзіцца. А такі спецыяліст быў бы вельмі карысным, асабліва на этапах медыцынскага тэсціравання студэнтаў, а таксама калі ім даюцца нагрузачныя тэсты.

Для адпаведных тэстаў неабходнае пэўнае абсталяванне. Ад навукі тут ужо не схавацца. Мы маем лабараторыю. Такія прыборы, як «Лэдзіс–2К», «Дэтэст–3», былі распрацаваныя нашымі навуковымі супрацоўнікамі сумесна з цэнтрам спартыўнай медыцыны Міністэрства спорту і турызму. Гэтая апаратура паспяхова выкарыстоўваецца не толькі ў БДУ, але і ў медыцынскіх, лячэбна-прафілактычных установах і ў нацыянальных камандах Рэспублікі Беларусь, а таксама ў футбольным клубе БАТЭ.

Калі казаць пра студэнтаў са спецмедгрупай, то ў БДУ іх налічваецца больш за 3 тыс., што складае каля 27–28 % ад агульнай колькасці навучэнцаў. Траціну з іх складаюць хлопцы, а дзве траціны – дзяўчаты. Да таго, на прыродазнаўчых факультэтах сітуацыя лепшая, чым на гуманітарных. Для такой катэгорыі моладзі неабходна праводзіць медыцынскі агляд не радзей, чым раз на месяц. Лепш займацца ў малых групах, але натуральна, што колькасць вучэбных груп расце, і гэта патрабуе павелічэння памяшканняў для заняткаў, якіх, як ужо згадвалася, не хапае.

– Якраз да навукі. Якімі дасягненнямі ў гэтай галіне можа ганарыцца ваша кафедра?

– Акрамя згаданага, за апошнія 5 гадоў было выдадзена каля 260 навуковых прац – ад праблем матывацыі здаровага ладу жыцця, фарміравання правільнага харчавання, барацьбы са шкоднымі звычкамі і да пытанняў асобных відаў, такіх як футбол, валейбол і г. д. На аснове іх выдаюцца кнігі і дапаможнікі па занятках спортам і фізічнай культурай.

Распрацаваныя спецыялізаваныя прылады і камп'ютарныя праграмы выкарыстоўваюцца не толькі на нашай кафедры, але і ў іншых навучальных установах краіны і за мяжой: у Расіі, Польшчы, ва Украіне, Кітаі, Карэі і інш.

– Давайце яшчэ больш выйдзем за межы нашага ўніверсітэта. Якімі спартыўнымі здабыткамі на міжнароднай арэне можа ганарыцца БДУ?

– Студэнты БДУ ў складзе нацыянальных камандаў прэзентуюць нашу краіну на сусветных універсіядах, чэмпіянатах Еўропы, свету і на алімпіядах. Найбольшых поспехаў за 2008–2010 гады дасягнулі студэнты-спартоўцы па грэка-рымскай і вольнай барацьбе, лыжных гонках, мастацкай гімнастыцы, лёгкай атлетыцы, плаванні.

У алімпіядзе ў Пекіне бралі ўдзел пяцёра нашых студэнтаў, двое з якіх – Міхаіл Сямёнаў (грэка-рымская барацьба) і Надзея Астапчук (лёгкая атлетыка, штурханне ядра) – вярнуліся з бронзавымі медалямі.

Толькі за апошні час на чэмпіянатах свету і Еўропы было заваявана 13 медалёў: 1 залаты, 4 сярэбраныя і 8 бронзавых. Былі падрыхтаваны 2 майстры спорту міжнароднага класа, 15 майстроў спорту і 30 кандыдатаў у майстры спорту.

На зімовай алімпіядзе ў Ванкуверы выступалі дзве студэнткі БДУ (лыжныя гонкі).

– Значныя спартыўныя дасягненні проста так не прыйдуць: ані медалі чэмпіянатаў, ані проста ўдзел у іх, нават калі ты вельмі таленавіты і здатны. Неабходна шмат трэнірававацца. Але як сумяшчаць заняткі спортам непасрэдна з вучобай – прамым абавязкам студэнтаў?

– Калі вы выходзіце на высокі ўзровень, неабходна выбіраць: альбо станавіцца прафесійным спартоўцам, альбо пакінуць гэты занятак. Але ўдзельнічаць у Рэспубліканскай універсіядзе ці рэгіянальных, гарадскіх альбо ўнутрыўніверсітэцкіх спаборніцтвах і сумяшчаць гэта з вучобай цалкам рэальная рэч. Галоўнае тут – ваша жаданне.

– Як Вы адзначалі, наш прыярытэт – сілавыя віды. А як жа гульнявыя, тыя ж футбол, баскетбол і г. д., за выключэннем валейбола, вядома, дзе наша каманда ўзяла бронзу ўніверсіяды?

– Уся праблема вынікае з недахопу залаў. Але зразумела, што гульнявыя віды самыя папулярныя і самыя студэнцкія. Яны заўсёды стаяць на першым месцы. А так, адносна нас, безумоўна, мы ставім прыярытэт на сілавыя віды. Бо той жа футбол патрабуе стварэння прафесійнай каманды, тады і будуць вынікі.

Анатоль Капскі, гендырэктар завода БАТЭ, імкнецца да стварэння адпаведнага брэнда БАТЭ, як, напрыклад, іспанская Барселона, якая мае не толькі футбольны клуб. І мы, разам з барысаўчанамі, стварылі сваю валейбольную каманду «Барысаў (БАТЭ–БДУ)», якая выступае ў найвышэйшай рэспубліканскай лізе.

Таксама асобныя нашы каманды па баскетболе, мініфутболе выступаюць у першай лізе, але не найвышэйшай.

– Толькі распачаўся новы год. Якія задачы стаяць перад намі ў перадалімпійскім цыкле?

– Зараз мы рыхтуемся ды выступлення на ўніверсіядзе, што адбудзецца бліжэйшым часам у Ізміры (Турцыя). І, канечне, неабходна весці мэтанакіраваную падрыхтоўку, асабліва нашых лёгкаатлетаў і барцоў, да алімпіяды ў Лондане.

Гутарыў Алесь НОВІКАЎ

ЮБІЛЕІ

Галіноваму прафсаюзу супрацоўнікаў адукацыі і навукі 90 год!

Прафсаюзныя арганізацыі супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ дзейна ўключыліся ва ўсе мерапрыемствы, звязаныя са святкаваннем 90-годдзя галіновага прафсаюза супрацоўнікаў адукацыі і навукі, якія будуць праводзіцца на працягу 2011 года.

Пачаткам афіцыйнай гісторыі гэтай арганізацыі з'яўляецца 8 студзеня 1921 года, калі ў Мінску адкрыўся I з'езд Саюза супрацоўнікаў асветы і сацыялістычнай культуры. У юбілейны год усе намаганні галіновага прафсаюза будуць накіраваны на павышэнне якасці прафсаюзнай работы і найперш на ўзмацненне яго абарончых функцый.

Прафсаюз супрацоўнікаў адукацыі і навукі аб'ядноўвае каля 600 тысяч супрацоўнікаў і навучэнцаў навучальных установ і з'яўляецца адной з найбуйнейшых членскіх арганізацый Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Прафсаюз супрацоўнікаў БДУ налічвае каля 7 тысяч чалавек. Прафсаюз жа студэнтаў БДУ сплочвае больш за 17 тысяч студэнтаў.

Пачатак святочным мерапрыемствам паклала прэс-канферэнцыя з нагоды юбілею. У сваім выступленні перад журналістамі старшыня цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза супрацоўнікаў адукацыі і навукі Аляксандр Бойка

Падчас прэс-канферэнцыі

Алясандр Бойка

закрануў асноўныя праблемы галіны – пытанні сацыяльна-эканамічнай абароны, аховы працы і тэхнікі бяспекі, ролі прафсаюзнага лідарства, сацыяльнага партнёрства. Акцэнт быў зроблены на тое, што пры асвятленні дзейнасці галіновага прафсаюза неабходна больш увагі надаваць людзям, якія сваёй штодзённай і добрасумленнай працай забяспечваюць вучэбны працэс, сеюць добрае, светлае, вечнае сярод моладзі.

Да гэтай падзеі прафкам супрацоўнікаў БДУ зладзіў 21–23 студзеня спартыўна-аздараўленчае свята. З нагоды юбілею 11–13 лютага пройдуць і фінальныя спаборніцтвы круглагадовай спартакіяды «Здароўе» . У лютым да 90-годдзя галіновага прафсаюза будзе прымеркавана і ўрачыстае пасяджэнне прафкама БДУ.

Падчас святкавання юбілею ўніверсітэцкія прафсаюзныя арганізацыі прымуць удзел у злёце маладых вучоных і выкладчыкаў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, пад назвай «Будучыня пачынаецца сёння», а таксама ў рэспубліканскім конкурсе на найлепшую рэалізаваную калектыўную дамову ў арганізацыях сістэмы Міністэрства адукацыі, у Рэспубліканскім конкурсе «Прафсаюзны лідар», у рэспубліканскім конкурсе праектаў навучэнскай моладзі «Мой прафсаюз!», у конкурсе на найлепшае асвятленне дзейнасці Беларускага прафесійнага саюза супрацоўнікаў адукацыі і навукі ў сродках масавай інфармацыі і іншых мерапрыемствах, якія прапануе галіновы прафсаюз у юбілейны год.

Ганна ЛАГУН

НА ЗАМЕТКУ

СЫХОДЗЯЧЫ, ТУШЫЦЕ СВЯТЛО!

Пакідаючы вокны адчыненымі ці забываючы патушыць святло, мы часам забываемся пра эканомію энергіі. Гэтая несвядомасць адрознівае нас ад жыхароў краін Еўропы і ЗША, дзе эканомія даўно стала стылем жыцця і адным са спосабаў захавання сямейнага бюджэту. Вядома, за мяжой камунальныя плацяжы ў некалькі разоў перавышаюць беларускія, аднак рост тарыфаў ЖКГ не абміне і нашу краіну.

Такім чынам, пытанне эканоміі так ці інакш паўстане перад спажыўцом. Але для зніжэння спажывання энергіі зусім не абавязкова ахвяраваць камфортам: дастаткова прытрымлівацца некалькіх рэкамендацый, якія дапамогуць адчувальна скараціць выдаткі на аплату жыллёва-камунальных паслуг.

НА ЗМЕНУ «ЛЯМПЕ ІЛЬЫЧА»

«Сыходзячы, тушыце святло!» – савецкі заклік да эканоміі электраэнергіі застаецца актуальным і сёння. Але яшчэ лепш змяніць традыцыйныя «лямпы Ільіча» на сучасныя энергазберагальныя лямпы. Першыя расходуюць да 95 % электраэнергіі на нагрэў і толькі 5 % на асвятленне. Кампактныя люмінесцэнтныя лямпы зробленыя інакш, што дазваляе эканоміць да 80 % энергіі пры нязменнай яркасці асвятлення.

Пры выбары энергазберагальнай лампы звыклыя для нас неабходныя ваты трэба дзяліць на 4. Замяніўшы лямпу напальвання 75 Вт на энергазберагальную магутнасцю 15 Вт, вы зэканоміце 60 Вт. Нягледзячы на тое, што кошт энергазберагальных лямпаў вышэйшы на 30–40 %, тэрмін іх службы ў сярэднім складае 8 тыс. гадзін, г. зн. 4 гады, а лямпы напальвання – 1 тыс. гадзін, г. зн. 0,5 года. Акрамя таго, выбіраючы энергазберагальную лямпу, мы можам выбраць неабходны нам колер асвятлення па маркіроўцы, нанесенай на цокаль: 2700 К – цёплы (аналагічны лямпе напальвання), 3200 К – сонечны, дзённае святло, звыш 4000 К – блакітны (халодны).

Дарэчы, у краінах Еўропы лямпы напальвання прызнаныя неэфектыўнымі яшчэ некалькі гадоў таму, і іх вытворчасць цалкам спынена. Аналагічныя захады зроблены ў ЗША, Аўстраліі і Новай Зеландыі.

У ЧАКАННІ ВЫДАТКАЎ

Здавалася б, спажыванне энергіі бытавой тэхнікай і электронікай у рэжыме чакання – standby – мінімальнае, але гэта не зусім так.

Спецыялісты разлічылі, што тэлевізары дыяганаллю 54 см, найбольш папулярныя, марнуюць у рэжыме чакання парадку 9 кВт/г у месяц, музычныя цэнтры – у сярэднім 8 кВт/г, а DVD-плэеры – каля 4 кВт/г. Калі дадаць да гэтага спісу камп'ютарную тэхніку, мікрахвалевую печ, кандыцыянер, зарадныя прылады мабільнага тэлефона, пакінутыя ўключанымі ў разетку, і іншыя прыборы, то сумарнае энергаспажыванне прыбораў у рэжыме чакання можа дасягаць 350–400 кВт/г у год.

Таму, калі тэхніка не выкарыстоўваецца, яе варта выключаць з разеткі альбо націскаць кнопку адключэння сілкавання.

КЛАСАВЫЯ АДРОЗНЕННІ І АСАБЛІВАСЦІ ЭКСПЛУАТАЦЫІ

Далёка не ўсе ведаюць, што пры набыцці бытавой тэхнікі і электронікі акрамя ўсяго іншага неабходна звярнуць увагу на клас энергаэфектыўнасці прыбора.

Менш за ўсё электраэнергіі спажываюць прыборы класа A, далей стаяць класы B, C і D. Бытавую тэхніку класаў E–G, для якіх характэрнае высокае энергаспажыванне, сёння практычна не вырабляюць.

Напрыклад, A-халадзільнікі патрабуюць у сярэднім 0,9 кВт/г у суткі, а C – каля 1,45 кВт/г. Такім чынам, эканомія электраэнергіі пры выкарыстанні халадзільніка класа A складае каля 200 кВт/г у год.

Залогам эканоміі служыць і правільная эксплуатацыя бытавых электрапрыбораў. Напрыклад, запоўнены на траціну мяшок пыласоса павялічвае выдаткі энергіі прыблізна на 40 %. У сваю чаргу, пры няпоўнай загрузцы аўтаматычная пральная машына марнуе 10–20 % энергіі. Тое ж самае можна сказаць і пра халадзільнік, устаноўлены паблізу пліты, радыятара цэнтральнага ацяплення або абагравальніка.

ЗАМЯНЯЕМ ВОКНЫ І ЎЦЯПЛЯЕМ ДЗВЕРЫ

У халодную пару цёплае паветра выходзіць праз шчыліны ў драўляных аконных рамах. Таму іх неабходна ліквідаваць пры дапамозе герметыка, аконнай замазкі і самаклейных ушчыльнікавых пракладак. Яшчэ больш эфектыўным захадам з'яўляецца ўстаноўка сучасных аконных сістэм, канструкцыя якіх выключае ўзнікненне шчылін. Такія шклопакеты маюць бесперапынны контур ушчыльнення, які добра прылягае да рамы і прадухіляе прадзьмуванне.

Акрамя вокнаў варта памяняць ці ўцяпліць уваходныя дзверы, а таксама ліквідаваць шчыліны паміж створкай дзвярэй і рамай. Напрыклад, для ўцяплення «сейфавых» дзвярэй дастаткова змясціць паміж металам і ўнутранай абліцоўваннем слой цеплаізаляцыйнага матэрыялу. Для ліквідацыі шчылін можна выкарыстоўваць ушчыльнікавыя самаклейныя пракладкі з сіліконавай гумы або гумы EPDM.

Уцяпленне ўваходных дзвярэй і ліквідацыя шчылін значна паляпшае гукаізаляцыю, што асабліва актуальна, калі дзверы выходзяць у пад'езд шматкватэрнага дома або на ажыўленую вуліцу.

ВЫБІРАЕМ КАЦЁЛ

Знізіць выдаткі на ацяпленне можна, усталяваўшы ў доме эфектыўнае кацельнае абсталяванне. Цяпер усё большае распаўсюджванне атрымліваюць кандэнсацыйныя катлы, спажыванне газу якімі ў параўнанні са звычайнымі зніжана на 30 %.

Дарэчы, у некаторых краінах Еўропы, дзе праблемам энергетычнай эфектыўнасці надаецца павышаная ўвага, забаронена выкарыстанне любога газавага ацяпляльнага абсталявання акрамя кандэнсацыйнага. Абмежаванні ўжо ўведзены ў Бельгіі і Вялікабрытаніі, а ў найбліжэйшыя некалькі гадоў падобныя забароны пачнуць дзейнічаць у Іспаніі, Германіі і Францыі.

СОЧЫМ ЗА ТЭМПЕРАТУРАЙ

Пры павышэнні тэмпературы паветра ў пакоі ўсяго на 1°C спажыванне цеплавой энергіі павялічваецца на 6 %. Таму спецыялісты рэкамендуюць усталёўваць на ўсе радыятары сістэмы ацяплення тэрмастатныя вентылі, якія дазваляюць рэгуляваць тэмпературны рэжым для жылых і нежылых памяшканняў.

Для спальні камфортная тэмпература складае каля 21°C, у той час на кухні дастаткова і 18°C. Акрамя таго, неабходна прытрымлівацца аптымальнага рэжыму праветрывання. Пастаянна адчыненае акно або фортка прыводзіць да вялікіх страт цяпла. Значна больш эфектыўна цалкам адчыніць акно на некалькі хвілін, а затым шчыльна яго зачыніць.

УВАГА, БАТАРЭІ

Каб у памяшканні было цяплей, зусім не абавязкова ўключаць электрычныя абагравальнікі. Перш за ўсё неабходна рэгулярна выпускаць з радыятараў назапашанае там паветра, якое перашкаджае свабоднай цыркуляцыі вады і зніжае эфектыўнасць працы сістэмы ацяплення.

Не варта загароджваць батарэі ацяплення мэбляй, занавесамі або дэкаратыўнымі экранамі, бо так у пакой не трапляе да 20 % цяпла.

І нарэшце, зніжэнню спажывання цеплавой энергіі спрыяе дадатковая тэрмаізаляцыя нішаў, у якіх размешчаны батарэі, і ўстаноўка ў іх цяплоадбівальных экранаў. Згодна з разлікамі, гэта дазваляе эканоміць каля 4 % выдаткаў на ацяпленне.

Акрамя таго, святло пры ўваходзе ў памяшканне можа ўключацца і выключацца аўтаматычна. Для гэтага трэба ўсталяваць датчык руху свяцільнікаў (аўтаматычны інфрачырвоны выключальнік). Датчыкі руху – зручныя прыборы для дома і офіса. З іх дапамогай дом становіцца больш бяспечным: нават пры «няпамятлівасці» або спешцы электрычныя прыборы адключацца пасля вашага сыходу. Калі запальваць свяцільнікі толькі там, дзе вы знаходзіцеся, і тушыць іх пры вашым выхадзе з гэтага памяшкання, датчыкі руху вельмі эканомяць электраэнергію.

Веданне простых спосабаў эканоміі энергіі дапаможа істотна знізіць эксплуатацыйныя плацяжы. У некаторых выпадках дастаткова прытрымлівацца правілаў рацыянальнага энергаспажывання, у іншых, як у выпадку з уцяпленнем, укласці пэўныя сродкі. Аднак, як паказвае практыка, гэтыя выдаткі акупляюцца даволі хутка і забяспечваюць не толькі эканомію энергіі і бюджэту, але і камфортнае пражыванне.

Пётр СТАВЕР,
дзяржінспектар па энерганаглядзе

УНІВЕРСІТЭТ

28 студзеня 2011 года, № 1-2 (2039-2040)

КАЛЕЙДАСКОП

Вялікая будучыня.

Навуковыя вынікі 2010 года

У 2010 г. навука бадзёра развівалася ва ўсіх галінах. Фізікі здолелі злавіць атамы антыматэрыі, астраномы амаль знайшлі планеты, на якіх магло б існаваць жыццё, біёлагі расшыфроўвалі геномы новых відаў людзей, а інжынеры запускалі прыватныя касмічныя караблі. Усе гэтыя і іншыя цікавыя падзеі мінулага года прадстаўлены ў кароткім аглядзе навуковых вынікаў.

АСТРАНОМІЯ

Астранамічныя навіны традыцыйна займаюць самыя прывілеяваныя месцы на палосах усіх навуковых СМІ – адкрыцці астраномаў адрозніваюцца маштабнасцю і рамантычнай загадкавасцю. У 2010 г. даследчыкі космасу не раз апраўдалі чаканні, напрыклад, паведамленнем аб выяўленні самага аддаленага аб'екта ў Сусвеце (а значыць, і самага старога з вядомых). Ім аказалася галактыка са складанай назвай UDFy–38135539, якая ўтварылася праз нейкіх 600 мільёнаў гадоў пасля Вялікага выбуху (зараз ёй 13,1 млрд гадоў) і змясціла з пастамента папярэдняга рэкардсмена – гама-ўсплёска ва ўзросце 13 мільярдаў гадоў.

* * *



Так выглядае «вачыма» прыбораў анігіляцыя «звычайнай» матэрыі з малекуламі антывадароду, якія выслізнулі ад навукоўцаў. Выява CERN

* * *

У 2010 г. астраномы знайшлі, але амаль адразу ж страцілі патэнцыйна заселеную планету Gilese 581g. Затое пад самы канец года навукоўцы зноў прыйшлі да высновы, што на «суседцы» ненадзейнай Gilese 581g цалкам можа існаваць вадкая вада – неабходны элемент для гіпатэтычных насельнікаў планеты. Самае прыемнае, што сістэма зоркі Gilese 581 размешчана адносна недалёка ад Зямлі – святло дабіраецца туды ўсяго 20,5 гадоў.

* * *

Акрамя больш-менш аддаленых аб'ектаў астраномы вывучалі і блізкую касмічную прастору. Апарат NASA пад назвай Deep Impact 4 лістапада праляцеў на смешнай па касмічных мерках адлегласці ў 700 кіламетраў ад каметы Хартлі-2 (яшчэ ў верасні іх аддзяляла 600 мільёнаў км). Падчас збліжэння з каметай зонд атрымаў мноства фатаграфій, якія астраномам толькі трэба вывучыць, а таксама высветліў, што Хартлі-2 «працуе» на змерзлым вуглякіслым газе, а не на вадзяным лёдзе і плюецца цыянідамі.



Ядро каметы Хартлі-2. Фота NASA/JPL-Caltech/UMD

* * *

Яшчэ адзін размешчаны недалёка аб'ект, які прынёс астраномам шмат сюрпрызаў у 2010 г., – Месяц. У 2009 г. NASA скінула на яго паверхню адразу два «снарады», якія паднялі воблака пылу. Ужо праз два месяцы пасля бамбавання навукоўцы паведамілі, што ў выкінутым месячным грунце ёсць вада. У кастрычніку 2010 г. даследчыкі прадставілі вынікі больш поўнага аналізу, якія паказалі, што вады ў некаторых рэгіёнах Месяца ўдвая больш, чым у пустыні Сахара. Акрамя таго, рэгаліт, як яшчэ называюць паверхневы пласт зямнога спадарожніка, утрымлівае вялікія запасы серабра, магнію, ртуці, кальцыю, монаксіду вугляроду і іншых рэчываў, якія цалкам спатрэбіліся б у палявой лабараторыі будучых месячных пасяленцаў. Яшчэ адно «месячнае» дасягненне мінулага года – складанне самай дакладнай карты зямнога спадарожніка.

* * *

Нарэшце, у 2010 г. на Зямлю трапілі часціцы пылу з самага сапраўднага незямнога аб'екта – японскі зонд «Хаябуса» прынёс у сваім кантэйнеры каля 1,5 тысяч дробных часціц з паверхні астэроіда Ітакава. Створаны людзьмі апарат упершыню даставіў на Зямлю фрагменты астэроіда, а ў агульным спісе зондаў, якія прынеслі на планету іншапланетны грунт, «Хаябуса» стаў шостым.

ФІЗІКА

Фізікі ў 2010 г. практычна дагналі астраномаў па частаце згадванняў у СМІ. Галоўнымі «паравозамі» фізічных навін былі калайдары – знакаміты Вялікі адронны калайдар, пабудаваны на мяжы Швейцарыі і Францыі, і менш раскручаны амерыканскі Тэватрон. У кастрычніку з'явілася паведамленне, што на адным з дэтэктараў BAK – CMS – быў зарэгістраваны дзіўны эфект: пры некаторых сутыкненнях пратонаў часціцы ўтвараліся і разляталіся ад месца нараджэння не абсалютна незалежна адзін ад аднаго (такія паводзіны часціц называюць скарэляванымі). Растлумачыць прыроду з'явы можна будзе толькі пасля дадатковых эксперыментаў.

* * *

У лістападзе фізікі, якія аналізуюць сабраныя на BAK даныя, заявілі аб рэгістрацыі з'явы, важнай для «злову» славутага базона Хігса – часціцы, якая адказвае за наяўнасць масы ва ўсіх іншых часціц (у тым выпадку, вядома, калі цяперашнія мадэлі, якія тлумачаць лад фізічнага свету, дакладныя). Навукоўцы зафіксавалі нараджэнне пар Z-базонаў – гэтыя элементарныя часціцы могуць утварацца, у прыватнасці, пры распадзе базона Хігса. Але для доказу неабходна зафіксаваць яшчэ мноства такіх падзей.

* * *

Безумоўным фізічным прарывам 2010 г. можна назваць утрыманне атамаў антырэчыва ў спецыяльнай пастцы на працягу доўгага часу. Навукоўцам з Еўрапейскага цэнтра ядзерных даследаванняў (CERN) удалося сінтэзаваць атамы антывадароду і ўтрымаць 38 з іх у пастцы на працягу дзясятых секунды. Выкарыстоўваючы новую тэхналогію, фізікі тэарэтычна змогуць атрымаць спектр антывадароду, які дапаможа ім пацвердзіць або абвергнуць прынцып CPT-сіметрыі і заадно агульныя ўяўленні аб арганізацыі Сусвету.

* * *

Яшчэ адна дзіўная навіна мінулага года – змяншэнне памеру пратона. Па вынікаў самых дакладных на сёння вымярэнняў, даследчыкі заключылі, што радыус гэтай часціцы на чатыры працэнты меншы, чым было прынята думаць, і складае 0,84184 фемтометра (фемтометр – 10^{-15} метра). Два іншыя дасягненні адносяцца да квантавай механікі: навукоўцам упершыню ўдалося атрымаць кандэнсат Базэ-Эйнштэйна на аснове фатонаў і прадэманстраваць квантавыя эфекты для амаль макраскапічнага аб'екта.

* * *

Расійскія фізікі ў красавіку мінулага года абвясцілі аб сінтэзе новага трансуранавага элемента перыядычнай табліцы Мендзялеева – супрацоўнікі Лабараторыі ядзерных рэакцый імя Флёрава АІЯД у Дубне зафіксавалі шэсць падзей нараджэння ядраў 117-га элемента.

* * *

Нарэшце, у 2010 г. фізікі эксперыментальна пацвердзілі запаволенне часу, прадказанае ў рамках агульнай і спецыяльнай тэорый адноснасці Эйнштэйна. Навукоўцы пры дапамозе звышдакладнага атамнага гадзінніка змаглі атрымаць доказы як запаволення часу паблізу масіўных аб'ектаў (назіральніку, які знаходзіцца далей ад аб'екта, будзе здавацца, што гадзіннік яго напарніка, які стаіць побач з аб'ектам, ідзе павольней), так і запаволення ходу гадзінніка пры руху (з пункта гледжання нерухомага назіральніка стрэлкі на гадзінніку калегі ў руху будуць перамяшчацца павольней).

МАТЭМАТЫКА

Мінулы год быў нечакана насычаны навінамі са свету матэматыкі – звычайна гэта навука не трапляе на старонкі папулярных выданняў з-за сваёй надзвычайнай складанасці і абстрактнасці. Матэматычны бум пачаўся ў сакавіку, калі Матэматычны інстытут Клэя прысудзіў Прэмію тысячагоддзя расійскаму матэматыку Рыгору Перэльману за доказ гіпотэзы Пуанкарэ. Як і чакалася, Перэльман, які раней адмовіўся ад медаля Філдса – аналага Нобелеўскай прэміі для матэматыкаў, не захацеў прыняць і гэта прызнанне.

* * *

Зборка мазаікі ўсляпую – прыклад задачы класа складанасці NP. Вызначыць, ці правільна выкладзеныя ўсе фрагменты, лёгка, але вось атрымаць Мону Лізу з тысячы рознакаляровых кавалачкаў, перабіраючы іх спалучэнні, ужо не так проста.

* * *

Абмеркаванне (часцяком вельмі няветлівае) рашэння Перэльмана яшчэ не заціхла, калі з'явілася навіна, што індыйскі матэматык Вінэй Дэалалікар справіўся з яшчэ адной задачай тысячагоддзя – супрацоўнік лабараторыі Hewlett–Packard у Пала-Альта апублікаваў у сеціве 116-старонкавы артыкул з доказам няроўнасці класаў складанасці P і NP. За таямнічай фармулёўкай хаваецца вельмі важная матэматычная праблема, рашэнне якой, у прыватнасці, дазволіць адказаць на пытанне, ці змогуць зламыснікі навучыцца разгадваць складаныя шыфры ці гэта немагчыма ў прынцыпе. Вестка аб прарыве Дэалалікара прымусіла сотні матэматыкаў па ўсім свеце кінуць сваю паўсядзённую працу і заняцца праверкай доказу індыйца. Не прайшло і тыдня, як у яго выкладках былі знойдзеныя сур'ёзныя памылкі, так што пытанне роўнасці класаў складанасці па-ранейшаму застаецца адкрытым (хоць большасць спецыялістаў упэўнена, што яны не роўныя).

* * *

Былі ў мінулым годзе і дасягненні, якія матэматычная супольнасць адзначыла ўручэннем медаля Філдса. У 2010 г. адным з лаўрэатаў «матэматычнай Нобелеўкі», якая ўручаецца раз у чатыры гады, стаў расіянін Станіслаў Смірноў з Санкт-Пецярбурга, які працуе ў Жэневе. Ён удастоіўся ўзнагароды за свае працы па тэорыі перкаляцыі.

* * *

Нарэшце, у 2010 г. была з рэкордней дакладнасцю палічана лічба пі – цяпер яна ўтрымлівае 2 трыльёны 699 мільярдаў 999 мільёнаў 990 тысяч знакаў пасля коскі. Папярэдняя версія змяшчала ўсяго каля 2,6 трыльёна знакаў.

БІЯЛОГІЯ

Для біялогіі 2010г. быў па-сапраўднаму выдатным. Дзякуючы расшыфроўцы геному неандэртальца, выкананай у лабараторыі Свантэ Пааба ў Лейпцыгскім інстытуце эвалюцыйнай антрапалогіі, навукоўцы высветлілі, што прадстаўнікі гэтага віду людзей скрыжоўваліся з нашымі непасрэднымі продкамі. Наступствы цесных сувязяў паміж двума відамі захаваліся ў геноме ўсіх жыхароў Зямлі, за выключэннем карэнных афрыканцаў. Як аказалася, у нашых храмасомах маецца ад 1 да 4 % неандэртальскіх генаў.

Свантэ Пааба з чэрапам аднаго са сваякоў Homo sapiens

* * *

Наогул, у 2010 г была прадэманстраваная моц генетычнага падыходу да біялагічных даследаванняў. Напрыклад, у лютым навукоўцы прадставілі вельмі падрабязнае апісанне знешнасці і біяхіміі чалавека, які жыў на тэрыторыі Грэнландыі каля 4 тыс. гадоў таму. Гэтая праца заслугоўвае ўвагі і сама па сабе, але сапраўды выбітнай яе робіць той факт, што ўсе гэтыя звесткі навукоўцы «выцягнулі» з пасмачкі валасоў, якая захавалася на знойдзеным у Грэнландыі грэбені. Іншых крыніц інфармацыі ў даследчыкаў не было. Іншы прыклад – вылучэнне ДНК з закамянелай шкарлупіны знішчаных чалавекам гіганцкіх птушак, якія калісьці насялялі Аўстралію, Новую Зеландыю і Мадагаскар. А ўсяго пяць гадоў таму здагадка, што грубыя кавалкі фактычна каменя могуць служыць крыніцай самай вычарпальнай інфармацыі пра старажытных птушак, выклікала б здзіўленне і ўсмешкі многіх навукоўцаў.

* * *

Адным з самых гучных, але адначасова і самых спрэчных біялагічных дасягненняў 2010 г. стала стварэнне арганізма са штучным генам. Аўтарам гэтай працы выступіў адыёзны біёлаг Крэйг Вентэр са сваімі супрацоўнікамі. Менавіта дзякуючы Вентэру навукоўцы змаглі ўпершыню расшыфраваць геном чалавека да 2001 г. Таксама Вентэр змог de novo сінтэзаваць поўны геном бактэрыі і перасадзіць яго ў пустую клетку роднаснага мікраарганізма. Гэтая каласальная па працаёмкасці работа, на думку Вентэра, мае важны практычны і нават філасофскі сэнс, аднак вельмі многія яго калегі, мякка кажучы, сумняваюцца ў навуковай каштоўнасці праведзенага эксперыменту.

НЯЎДАЧЫ ГОДА

Аповед пра развіццё навукі за мінулы год быў бы няпоўным без згадвання антыдасягненняў і няўдач. У 2010 г. навукоўцы так і не прынялі канчатковага рашэння наконт тэрмінаў і кошту стварэння эксперыментальнага тэрмаядзернага рэактара ITER. Падчас працы над праектам рэактара неабходныя аб'ёмы фінансавання ўвесь час растуць, і адначасова памяншаецца жаданне краіндзельніц укладвацца ў праект з невыразнай аддачай.

* * *

У 2010 г. сумна скончылася нядоўгая навуковая кар'ера адзінага расійскага навуковага спадарожніка «Каронас–Фатон» для вывучэння Сонца. З-за памылкі ў разліках магутнасці акумулятараў спадарожніка праз месяц пасля выведу на арбіту ў яго пачалі адключацца прыборы. Яшчэ адна расійская няўдача – аварыйны запуск трох спадарожнікаў ГЛОНАСС 5 снежня 2010 г. Ракета-носьбіт не змагла вывесці апараты на арбіту з-за няправільна напісанай формулы ў тэхнічнай дакументацыі на запраўку разгоннага блока.

* * *

Чалавечы фактар стаў прычынай яшчэ аднаго навуковага правалу года. Нобелеўскі лаўрэат па фізіялогіі і медыцыне 2004 г. Лінда Бак адклікала з навуковых часопісаў адразу дзве свае публікацыі з-за таго, што яна і яе супрацоўнікі перасталі давяраць зробленым у іх высновам. Вядучым аўтарам абодвух артыкулаў быў кітайскі даследчык Чжыхуа Цзоу. Гэтая гісторыя яшчэ раз падкрэслівае, наколькі важнае кадравае пытанне ў навуцы.

* * *

2010 г. стаў апошнім у жыцці марсахода «Спірыт», які разам са сваім «блізнём» «Апарт'юніці» з 2004 г. даследаваў паверхню Чырвонай планеты. У сакавіку 2009 г. «Спірыт» праваліўся ў пясчаную пастку, з якой не змог выбрацца, нягледзячы на ўсе намаганні спецыялістаў.

* * *

У мінулым годзе Амерыка адмовілася ад сваёй месячнай праграмы, аднак адназначна аднесці гэта рашэнне да правалаў нельга: у новай амерыканскай стратэгіі асваення касмасу зробленая стаўка на прыватную касманаўтыку, якая можа пацясніць дзяржаўную ў самы бліжэйшы час. У пачатку снежня 2010 прыватны грузавы касмічны карабель Dragon кампаніі SpaceX здзейсніў першы палёт на арбіту, зрабіў два віткі вакол планеты і шчасліва прыводніўся ў Ціхім акіяне.

Увогуле, мінулы год быў ураджайным на навуковыя дасягненні, многія з якіх маюць шанцы на працяг.

Па матэрыялах інтэрнэт-рэсурсаў

УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

28 студзеня 2011 года
Падпісана да друку 26.01.2011 г.
Зак. . Тыраж 2000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырванаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by